СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск —4.42, 21.43, 17.01;
Віцебск —4.24, 21.42, 17.18;
Магілёў —4.32, 21.33, 17.01;
Гомель —4.39, 21.20, 16.41;
Гродна —5.00, 21.57, 16.57;
Брэст —5.09, 21.48, 16.39.
МЕСЯЦ:
Маладзік 30 чэрвеня.
ІМЯНІНЫ:
Мяфодзія, Глеба, Андрэя, Іны, Апанаса;
Яцка, Анатоля.

# ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 ЛІПЕНЯ 1992 г.
пятніца, № 132 (21910)

● цана 1 рубель

## РОЗГАЛАС

### НАМ ПАГРАЖАЕ РУБЛЁВЫ ЧАРНОБЫЛЬ?

Ёсць звесткі, што Украіна выходзіць з рублёвай зоны. «У выпадку, калі беларускі рынак акажацца ў выніку гэтага запоўненым расійскімі грошамі,—заявіла начальнік упраўлення грашовага абарачэння Нацыянальнага банка Беларусі Тамара Каржанеўская,—дык наша рэспубліка цалкам пяройдзе на разліковыя білеты, а рублі будуць зняты з абарачэння».

Любая дзяржава СНД, прыняўшы рашэнне аб уводзе сваёй нацыянальнай валюты, павінна зняць з абарачэння ранейшыя грошы і здаць іх у Расійскі банк. Калі ўмовы дагавора якой-небудзь з рэспублік не будуць выкананы, то яе суседзі будуць вымушаны абараняцца.

Святлана КУЛІКОВА,
БелаПАН.

### ДА ЎРУЧЭННЯ ВЯРЫЦЕЛЬНЫХ ГРАМАТ

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Аўстрыйскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Фрыдрых Баўэр 2 ліпеня ўручыў вярыцельныя граматы кіраўніку беларускага парламента Станіславу Шушкевічу.

Фрыдрых Баўэр нарадзіўся 23 кастрычніка 1930 года. Закончыў факультэт юрыдычных і грамадска-палітычных навук Венскага Універсітэта. У 1953 годзе яму прысуджана званне доктара юрыдычных навук.

У гэтым жа годзе Фрыдрых Баўэр паступіў на службу ў федэральнае міністэрства замежных спраў Аўстрыі. З 1955 года — супрацоўнік аддзела замежных спраў ведамства федэральнага канцлера Аўстрыі. З 1958 года працаваў у пасольстве Аўстрыі ў Бялградзе, з 1960 года — у цэнтральным апараце федэральнага міністэрства замежных спраў, з 1963 года — у пасольстве Аўстрыі ў Тэль-Авіве.

Затым з 1966 года ён — зноў у цэнтральным апараце МЗС. З 1970 года — загадчык бюро па міжнародных канферэнцыях і арганізацыях міністэрства замежных спраў, з 1973 года — пасол Аўстрыі ў Берліне, з 1977 года — загадчык аддзела палітычнага ўпраўлення МЗС і намеснік палітычнага дырэктара, з 1979 года — загадчык палітычнага ўпраўлення МЗС, з 1983 года — намеснік генеральнага сакратара па замежных справах. У 1986 годзе названы паслом Аўстрыі ў Боне, з лістапада 1990 года — паслом Аўстрыі ў Маскве.

Жанаты.

МЗС Рэспублікі Беларусь—(БЕЛТА).

### НАВУКА—НА ПЯЧОРНЫМ ЎЗРОЎНІ

МІНСК. Навука — рухавік прагрэсу. А ці не заглухне гэты рухавік у сувязі са штодзённымі катаклізмамі? Толькі за апошні час амаль 1,5 тысячы маладых таленавітых вучоных пакінулі беларускую Акадэмію навук. Не спынім «уцечку мазгоў», — можам скаціцца да пячорнага ўзроўню. Напэўна, ёсць аб чым задумацца.

ДЗЯРЖАЎНЫ
МЫТНЫ КАМІТЭТ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
пераехаў на новае месца па адрасу:
220123, г. МІНСК, вул. В. ХАРУЖАЙ, 29.
Тэл. для даведак:
34-41-41.

3 ЛІПЕНЯ — ДЗЕНЬ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

## СВЕТЛЫХ ДЗЁН У НАШАЙ ГІСТОРЫІ БЫЛО НЯШМАТ. СЁННЯ—АДЗІН З ІХ

Мы таксама былі амаль шчаслівыя. Народ-пераможца, выратавальнік свету. Перамога далася цяжка, але інакш было нельга. І святымі былі для кожнага словы Хатынь, Брэсцкая крэпасць... І штогод святкаваўся Дзень вызвалення — 3 ліпеня.

Мудрэйшымі за апошнія ненальні гадоў мы, мажліва, і не сталі, але ведаем цяпер шмат.

Ведаем і пра знішчэнне армейскага камандавання напярэдадні вайны, і пра гульні з Гітлерам, і пра злачынную непадрыхтаванасць да таго, чаго чакалі з дня на дзень. Ведаем пра здрадніцтва тым, хто апынуўся ў акупацыі і палоне, аб правакацыях дыверсантаў-нкусаўцаў, што выклікалі карныя аперацыі немцаў супраць мірнага насельніцтва. Пра асобныя чэхісцкія фарміраванні, заградатрады, якія стралялі з кулямётаў у спіну наступаючых байцоў — каб шпарчэй беглі. Ведаем, як не шкадавалі салдацкай крыві любімыя айцы-генералы і легендарныя маршалы, уже не кажучы пра Вярхоўнага галоўнакамандуючага. Як наступалі дрэнна навучаныя ўчарашнія сяляне прама на мінныя палі, і толькі потым ішлі сапёры і рабілі там праходы — для танкаў, бо падрываў салдат толькі проціпяхотныя міны, а на проціпанкавыя яго жывой вагі не хапала. Ведаем, колькі нашых загінуўшых прыпадае на аднаго забітага немца...

Мы ведаем — і нічога з гэтым не зробіш. Зваротнай дарогі ў мінуўшчыну няма. І мы ніколі ўжо не будзем у Дзень Перамогі ці 3 ліпеня такімі прыўзнята-ўрачыстымі. Найлепшасці шкада. Але што з таго? Новыя веды аб падзеях 48-гадовай даўнасці ўсё роўна не заслоняць іх простага сэнсу, а іменна: людзі вызвалялі ад ворагаў сваю зямлю, біліся за яе і гінулі. Як гінулі і раней — на працягу ўсёй гісторыі такога недасканалага чалавецтва. Таму будзем усё памятаць. Урачыстасцей можа і не быць, а памяць быць павінна.

Памяць і павага. Павага да мёртвых, да помнікаў, пад якімі яны ляжаць. Павага да жывых, безабаронных старых з медалямі альбо ордэнскімі планкамі на грудзях. Павага, а не раздражненне, нават тады, калі стары са сваім ветэранскім пасведчаннем бяры без чаргі міло каўбасы, альбо ў аўтобусе пачынае гучна павучаць моладзь. Яны жылі, як умелі, ваявалі, як маглі. Іх маладосць, якая здаецца ім цяпер цудоўнай, прыпала на страшныя, цяжкія часы, але і ў старасці, дзякуючы роднай дзяржаве, ім няма заслужанага спакою. Сённяшнія 20—30-гадовыя, пакладзіце руку на сэрца і шчыра прызнайцеся: ні такой маладосці, ні такой старасці вы для сябе ніколі б не пажадалі. Дык зрабіце так, каб хоць старасць пераможцаў карычневай чумы выглядала дастойнай Вялікай Перамогі. Гэта абавязак кожнага з нас.

Аляксандр БЯРСУДСКІ.
Фота Міхалая АМЕЛЬЧАНКІ.

## ФАДЫЁ ФАКТЫ

Электронных вартаўнікоў для аўтамабіляў пачынае выпускаць Брэсцкі электрамеханічны канцэрн. Пры спробе выкрадання ўключаецца сістэма сігналаў, якія паступаюць прама ў кватэру аўтаматара.

Ёсць і больш складаны прыбор. Напрыклад, калі злодзей на ўкрадзеным аўтамабілі праедзе міма паста ДАІ, абсталяванага адпаведнымі сістэмамі, то машына сама спыняецца каля міліцыі.

Што ж, гэта добра. Але трэба знайсці такога злодзея, каб сам пад'ехаў да паста ДАІ.

***

У Маскве аб'яўлена, што 4—5 ліпеня тут ці ў Падмаскоўі адбудзецца XXIX з'езд КПСС, партыйныя структуры якой аб'яўлены па-за законам прэзідэнтам Расіі Барысам Ельцыным. Месца правядзення з'езда ўтойваецца.

Паводле інфармацыі нашага карэспандэнта з Гомеля, прыкладна 600 былых членаў Камуністычнай партыі Беларусі прайшлі там перарэгістрацыю і аўтаматычна ўліліся ў новую партыю камуністаў Беларусі.

***

4 ліпеня адкрываецца міжнародны фестываль мастацтваў «Красная плошча запрашае».

Як сказаў дзяржаўны саветнік Расійскай Федэрацыі па палітычных пытаннях, старшыня аргкамітэта фестывалю Сяргей Станкевіч, «Гэта свята ўзніме духоўны патэнцыял народа, дапаможа ўзняцца над бытавымі праблемамі, набыць новую ўпэўненасць у сваіх сілах».

Хочацца ў гэта верыць. Дарэчы, не за гарамі віцебскі фестываль «Славянскі кірмаш».

***

Што ні дзень, то новыя факты незаконнага вывазу прадуктаў за межы рэспублікі.

Міліцэйскі патруль затрымаў грузавік з ноўгарадскімі нумарамі, які ішоў са Слаўгарадскага раёна ў Расію. Багаж быў важкі: 20 скрынак масла, 10—згушчанага малака і столькі ж канцэнтраванага. А закуплена ўсё гэта ў адным з сельскіх магазінаў. Адкуль у маленькім сельпо столькі дэфіцытных тавараў? Адказ на гэта пытанне шукаюць следчыя органы раёна.

***

Падмуркі раней невядомага храма XII стагоддзя знайшла ў час археалагічных раскопак непадалёк ад Сафійскага сабора ў Полацку экспедыцыя Акадэміі навук Беларусі. Археолагі сведчаць, што ў XI-XIII стагоддзях у Полацку было 10 храмаў і адзін княжаскі цэрам. Новая знаходка—сенсацыя сёлетняга археалагічнага сезона ў Беларусі.

## Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

### АБ НАДЗВЫЧАЙНЫХ МЕРАХ ПА ФАРМІРАВАННЮ ДЗЯРЖАЎНЫХ РЭСУРСАЎ ЗБОЖЖА Ў 1992 ГОДЗЕ

У сувязі з крытычнай абстаноўкай, якая складваецца з фарміраваннем дзяржаўных рэсурсаў збожжа, недахватам валютных сродкаў для набыцця яго за рубяжом і ў мэтах задавальнення патрэбнасцей насельніцтва рэспублікі ў хлебапрадуктах, а жывёлагадоўчых комплексаў і птушкафабрык у камбікармах Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Прыняць прапанову Дзяржэканомплана, Міністэрства сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання, Міністэрства хлебапрадуктаў аб фарміраванні ў 1992 годзе дзяржаўных рэсурсаў збожжа на харчовыя, насенныя, фуражныя мэты і для прамысловай перапрацоўкі ў аб'ёме 4,5 млн. тон, у тым ліку па Брэсцкай вобласці — 733 тыс. тон, Віцебскай — 684, Гомельскай — 686, Гродзенскай — 552, Мінскай — 1.130 і Магілёўскай вобласці — 715 тыс. тон.

2. Прызнаць неабходным увесці на 1992 год замест дзяржаўнага заказу абавязковую пастаўку збожжа ў дзяржаўныя рэсурсы рэспублікі калгасамі, саўгасамі і іншымі сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі, што вылічваецца з разліку 7,7 кілаграма збожжа за бала-гектар інтэнсіўна выкарыстоўваемых сельскагаспадарчых угоддзяў (ворная зямля, палепшаныя сенажаці і культурная паша).

Устанавіць, што аплата збожжа, якое нарыхтоўваецца ў лік указанай пастаўкі, ажыццяўляецца па цэнах згодна з дадаткам.

У выпадку змянення індэкса цэн на прамысловую прадукцыю (работы, паслугі), набываемую прадпрыемствамі сельскай гаспадаркі, праводзіцца ва ўстаноўленым парадку індэксацыя цэн на нарыхтоўваемае збожжа.

3. У мэтах стымулявання продажу збожжа дзяржаве ўстанавіць, што аплата збожжавых, збожжабабовых і алейных культур, якія нарыхтоўваюцца звыш абавязковай пастаўкі, праводзіцца па цэнах, указаных у дадатку, з надбаўкай у размеры 50 працэнтаў.

Дадатковыя расходы, звязаныя з фарміраваннем дзяржаўных рэсурсаў збожжа, ажыццяўляць у межах выдзеленых датацый на сельскагаспадарчую прадукцыю, хлеб і хлебабулачныя вырабы.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

### ВІТАМІННЫ АЛФАВІТ

## Шыпшына (дзікая ружа)

У сухіх пладах шыпшыны звычайна да 1 працэнта вітаміну С. Ёсць у іх і іншыя вітаміны, але ў значна меншай колькасці. Гэта вітаміны Р, каракін, якія ператвараюцца ў арганізме ў вітамін А, вітаміны $B_1$, $B_2$ і К, прысутнасць якіх садзейнічае ўзмацненню дзеяння вітаміну С. Шыпшына мае шэраг арганічных кіслот, солі фосфару, калію, кальцыю, магнію, а таксама жалеза і іншыя мікраэлементы.

Настой пладоў шыпшыны павышае супраціўленне арганізма інфекцыйным захворванням, інтаксікацыям, уздзеянню неспрыяльных умоў надвор'я. Дапамагае ён пры запаленчых захворваннях жоўцевых шляхоў і печані. Водны настой шыпшыны паляпшае харчаванне пры гастрытах, язвенай хваробе страўніка і дванаццаціперснай кішкі. Пры хваробе нырак і мачавога пузыра яго ўжываюць як супрацьзапаленчы, мачагонны і агульнаўмацавальны сродак.

Прыгатаванне настою шыпшыны. 20 г сухіх пладоў прамываюць у халоднай вадзе, затым заліваюць 0,5 літра кіпеню і кіпяцяць пры закрытай накрыўцы 10 хвілін, пасля чаго настойваюць у цёплым месцы 4—6 гадзін і працэджваюць. У настой з пладоў пераходзяць вітаміны і мінеральныя солі. Дабаўляюць па смаку цукар, мёд ці які-небудзь ягадны сіроп і п'юць па паўшклянкі 3 разы на дзень, захоўваюць настой шыпшыны на холадзе не больш чым 2 дні.

Пры прыгатаванні настою добра выкарыстоўваць тэрмас. Плады засыпаюць у тэрмас, заліваюць крутым кіпенем (40 грамаў сухіх пладоў на 1 літр кіпеню) і настойваюць 6—8 гадзін. Пры гэтым спосабе прыгатавання ў настой вітамінаў будзе больш, чым пры кіпячэнні.

## Чорныя парэчкі

Ягады іх багатыя на вітамін С. Змяшчаюць яны таксама каракін, вітамін Р, арганічныя кіслоты, дубільныя рэчывы і эфірны алей. Ягады выкарыстоўваюць свежымі, сухімі ці ў выглядзе сіропаў і варэння. Для прыгатавання напітку з сухіх ягад чорных парэчак іх заліваюць 2 шклянкамі кіпеню, настойваюць 1 гадзіну і выпіваюць на працягу дня.

У лісці чорных парэчак таксама многа вітамінаў. Побач з ягадамі, яны ўваходзяць у састаў вітамінных збораў. Ягады і лісце чорных парэчак з'яўляюцца цудоўным сродкам для лячэння і прафілактыкі вітаміннай недастатковасці.

## Рабіна

У спелых ягадах рабіны змяшчаецца 60—100 мг працэнтаў вітаміну С, да 18 мг працэнтаў каракіну (правітамін А), а таксама вітамін Р, яблычная і лімонная кіслата, солі калію, кальцыю, магнію і інш. Па колькасці каракіну плады рабіны пераўзыходзяць моркву, а па ўтрыманню вітаміну Р рабіна займае адно з вядучых месц сярод пладова-ягадных культур. Плады чарнаплоднай рабіны больш салодкія і смачныя, чым рабіны звычайнай. Аднак яны значна бяднейшыя на вітамін С і каракін.

Са свежых ягад рабіны можна прыгатаваць вітамінны сіроп ці варэнне. Сухія ягады заварваюць як чай (1 сталовая лыжка сухіх ягад заліваецца шклянкай кіпеню), настойваюць 1 гадзіну, затым выпіваюць за 2—3 прыёмы на працягу дня.

## «Фуражка» ад сонца і ад ветру...



Газетны ліст вельмі проста ператварыць у галаўны ўбор, здольны надзейна ахаваць галаву ад гарачых сонечных промняў і ветру. Паслядоўнасць ператварэння ліста паказана на малюнках і тлумачэнняў не патрабуе.

### СМАЧНА ЕСЦІ!

## Боршч украінскі з пампушкамі

300 г ялавічыны, 1 бурак, 400 г свежай капусты, 500 г бульбы, 1 морквіна, корань пятрушкі, 1 цыбуліна, 3—4 долькі часнаку, 1/2 шклянкі тамату-пюрэ ці 4—5 свежых памідораў, 1 сталовая лыжка мукі, 200 г тлушчу, 50 г свінога сала, 1/2 шклянкі смятаны, 1 сталовая лыжка цукру, сок палавіны лімона, зяленіва пятрушкі, чорны молаты духмяны і балгарскі перац, лаўровы ліст.

Для пампушак: 360 г мукі, 3/4 шклянкі малака, 20 г цукру, 10 г дражджэй, 30 г алею, 3 долькі часнаку, 80 г квасу для часночнай запраўкі.

Мяса зварыць да гатоўнасці. Ачышчаны памыты бурак нарэзаць саломкай, пасыпаць соллю, папырскаць сокам лімона, усё перамяшаць, пакласці ў каструлю ці неглыбокую патэльню, дадаць тлушч, сабраны з мяснога булёну, тамат-пюрэ, цукар і тушыць да паўгатоўнасці. Ачышчаныя і прамытыя карані і цыбулю нарэзаць саломкай і спасераваць з тлушчам. Булён працадзіць, мяса нарэзаць кавалачкамі. У працэджаны булён дабавіць нарэзаную долькамі бульбу, давесці да кіпення, апусціць нарэзаную саломкай свежую капусту і варыць 10—15 хвілін, дабавіць пасераваную агародніну, мучную запраўку, балгарскі перац, нашынкаваны тонкай саломкай, спецыі і давесці да гатоўнасці. Гатовы боршч заправіць салам, тоўчаным з часнаком і зяленівам, давесці да кіпення, даць настояцца на працягу 20—25 хвілін. Пры падачы на стол дабавіць смятану, мяса, зяленіва. Да баршчу падаць пампушкі з часнаком.

Пампушкі прыгатаваць так. У цёплым малацэ развесці дрожджы, соль, цукар, дабавіць алей і муку, замясіць цеста і пакінуць для бражэння. Гатовае цеста падзяліць на кавалкі масай па 25 г, скатаць шарыкі, пакласці на бляху, змазаную алеем, даць падысці і выпякаць пры тэмпературы 180—210°С. Часночную запраўку гатуюць так. У тоўчаны часнок дабаўляюць соль, алей, квас і ўсё перамешваюць, потым атрыманай запраўкай заліваюць свежаспечаныя пампушкі.

# БЕЛАРУШЧЫНА

● 36 урокаў для касіра

● Няродны ўнук роднага дзеда

● Што друкаваць?

ПРАЦЯГ РАЗМОВЫ

## Дзяржаўны ашчадны банк разумее па-беларуску

**У мінулым выпуску «Беларушчыны» быў надрукаваны ліст нашага чытача У. Малашчанкі пра тое, што ў філіяле № 1169/059 Мазырскага аддзялення Ашчаднага банка яму было адмоўлена ў выдачы разліковых білетаў, паколькі ордэр ён запоўніў па-беларуску.**

ШЧЫРА КАЖУЧЫ, мы і самі не чакалі, што публікацыя выкліча такі рэзанас — у рэдакцыю сталі тэлефанаваць чытачы, расказваючы, дзе і якім чынам яны трапілі ў сітуацыю, калі супрацоўнікі нацыянальнага банка не разумелі (альбо не хацелі разумець) дакументы, запоўненыя на беларускай мове.

Што гэта? Тэндэнцыя, пэўны накірунак ашчадбанка ў адносінах да беларусізацыі ці папросту недарэчныя памылкі, без якіх не абыходзіцца ніводная справа? Каб канчаткова расставіць кропкі над «і», мы звярнуліся ва ўпраўленне Дзяржаўнага ашчаднага банка Рэспублікі Беларусь.

— Пасля прыняцця Закона аб мовах ва ўсе вобласныя ўпраўленні ашчадбанка было накіравана пісьмо-тлумачэнне наконт таго, што запоўненыя на беларускай мове прыходна-расходныя дакументы павінны прымацца бесперашкодна, — сказаў намеснік начальніка ўпраўлення Дзяржашчадбанка Ігар РУДЫ. — Аднак некаторыя нашы супрацоўнікі праяўляюць «самадзейнасць» накшталт мазырскай (аналагічныя інцыдэнты былі ў Жлобінскім, Салігорскім, некаторых іншых філіялах). У кожным выпадку парушэння закона прымаліся канкрэтныя меры, вінаватыя неслі дысцыплінарную адказнасць.

— Дадам, што пасля некалькіх выпадкаў необгрунтаванага адмаўлення кліентам упраўленне разаслала па філіялах яшчэ адно пісьмо аб выкананні Закона аб мовах ад 5 лютага 1991 года № 08-3/129. — удакладняе **вядучы юрысконсульт Людміла КРЫВАНОСАВА.** — Між іншым, дадаткам да гэтага пісьма быў пераклад назваў месяцаў на беларускую мову. Хаця, безумоўна, ведаць гэта трэба і без службовай інструкцыі. Цяпер нашы супрацоўнікі вывучаюць мову на спецыяльна арганізаваных курсах па 36-гадзіннай праграме.

**— Значыць, у хуткім часе ў беларускамоўных кліентаў не будзе ніякіх праблем у ашчадных касах?**

— У прынцыпе — так, але трэба пры гэтым улічваць спецыфіку банкаўскай справы. Інструкцыя патрабуе, каб подпіс на расходным ордэры не адрозніваўся ад узору подпісу на банкаўскім дакументе. Калі, напрыклад, кліент раней даў узор подпісу на рускай мове— «Иванов», а ў ордэры распісаўся «Іваноў», то ў такім выпадку адмова будзе абгрунтаванай: несупадзенне подпісу.

**— Але падстава для такой блытаніны ліквідуецца сама сабой, як толькі банкаўскае справаводства будзе пераведзена на беларускамоўныя рэйкі?**

— Безумоўна. Мы, дарэчы, ужо размясцілі заказы на выраб ашчадных кніжак, бланкаў, разліковых чэкаў, квітанцый і іншых дакументаў на дзвюх мовах — рускай і беларускай.

**— Хіба ёсць такая неабходнасць? Чаму б не абмежавацца адной — дзяржаўнай?**

— Будзем глядзець праўдзе ў вочы: не ўсе добра разумеюць па-беларуску, нас жа столькі гадоў адвучвалі ад мовы...

**— Ну вось і была б у грамадзян нашай рэспублікі яшчэ адна нагода, каб ведаць мову— усведамленне, што без гэтага нават бланк не запоўніш. Своеасаблівы добраахвотна-прымусовы спосаб...**

— Лічым за лепшае не ствараць дадатковых цяжкасцей.

**— Значыць, пытанне наконт пераводу агульнага банкаўскага справаводства на дзяржаўную мову пакуль што не вырашана?**

— Мы толькі пачынаем рыхтавацца да гэтага, аналізуем сітуацыю... Банкаўская структура дастаткова кансерватыўная па сваёй сутнасці — так склалася гістарычна. Пераводзіць справаводства цалкам на беларускую мову пакуль што немэтазгодна. Трэба, каб закон дапамагаў працаваць, а не перашкаджаў. Глядзіце: усе сувязі, усе разлікі з дзяржавамі былога СССР — на рускай мове. Свежы прыклад: гэтымі днямі прыйшоў дагавор з Малдовы аб узаемных разліках — на рускай.

Калі не памыляюся, усе рэспублікі былога Саюза прынялі законы аб мовах — уявіце, калі б усе яны прысылалі дакументы на сваіх дзяржаўных мовах. Наколькі б гэта зацягнула банкаўскую работу! Дык навошта ж нам ствараць штучныя бар'еры? Пакуль для банкаўскай справы руская мова застаецца асноўнаю моваю зносін...

**Мы, гэтаксама як і супрацоўнікі паважанага Дзяржаўнага ашчаднага банка Рэспублікі Беларусь, мусім стаяць на пазіцыях разважнага сэнсу, і таму згодны, што ў цяперашніх умовах руская мова дапамагае плённым кантактам паміж ашчадбанкамі рэспублік былога Саюза (яна ж, па сутнасці, з'яўляецца моваю міждзяржаўных зносін паміж краінамі СНД). Аднак нельга пагадзіцца з тым, што нацыянальны банк—быццам бы «ідучы насустрач шматлікім пажаданням працоўных»— і ў перспектыве плануе абслугоўваць кліентаў з дапамогаю «двух языкоў у роце». Бо асноўны яго кліент — жыхар нашай (суверэннай!) дзяржавы, і ён, адважымся сцвярджаць, разумее і паважае сваю дзяржаўную мову. Дык, магчыма, ёсць сэнс яшчэ раз усё грунтоўна ўзважыць: каб прыняць рашэнне друкаваць бланкі дакументацыі на адной мове — дзяржаўнай? Гэта не той выпадак, калі трэба палохацца неразумення і непаразумення.**

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

НЕ ДРОБЯЗІ

## Даруй нас... Даруй нам...

*Ад памылак не застрахаваны ніхто. Нездарма ж дасціпна кажуць: «І хітры ліс у пастку трапляе, і на дзейку трэх бывае».*

*«Даруйце нас... Даруйце!» — чытаем загаловак аднаго з матэрыялаў «Рэспублікі» ад 27 чэрвеня. Газета цікавая, шануемая чытачом, апошнім часам усё больш настойліва паварочваецца да роднай мовы — тым больш прыкра за недарэчны «ляп». Аднак мы не сталі б прыгадваць яго наогул, калі б не патэлефанаваў пільны чытач:*

*— Пытанне на засыпку! Як правільна: «даруйце нас» або «даруйце нам»?*

*Ні для кага не сакрэт, што многія вывучаюць беларускую мову менавіта праз перыядычны друк. Калі газета напісала — значыць так правільна, так патрабуюць нормы літаратурнай мовы.*

*Але часцяком менавіта «дзякуючы» нам, журналістам, чытач атрымлівае мову ў перавернутым выглядзе: процьма «трасянкі», прамога калькіравання з рускай (як у гэтым выпадку: «простите нас»).*

*...Справа не ў тым, што мы гэтак фанабэрыста, пагардліва вырашылі «працягнуць» калег, па-мехтарску памахаць ім пальчыкам, — не. Размова пра тое, што мы, газетчыкі, самі не заўсёды ўсведамляем адказнасць за чысціню мовы, за яе лёс, — і гэта крыўдна. Соромна і за нашы памылкі, якія, здараецца, праскокваюць ў «Звяздзе». Мы вырашылі сказаць табе, чытач, пра ўсё адкрыта, каб яшчэ лепш усвядоміць гэтую сваю адказнасць і пастарацца не рабіць памылак, не ўводзіць цябе ў зман.*

**ДАРУЙ НАМ!**

## А настаўнік піша, піша...

*Тыдзень мінуў, як адшумелі выпускныя вечары ў школах, а настаўнікі яшчэ і дагэтуль не апамяталіся пасля напружанага марафону па запаўненню атэстатаў сталасці. Яны не перастаюць эдзіўляцца: навошта афармляць атэстаты па даўнейшаму савецкаму ўзору — рабіць укладыш з адзнакамі не толькі ў беларускім варыянце, але і ў рускім таксама? Для якога ж «дзядзькі» мы цяпер гэта робім?*

*І другая навіна: калі раней ва ўкладышах асноўныя вывучаемыя прадметы былі надрукаваны друкарскім спосабам, дык зараз нават назвы прадметаў трэба пісаць «ручную» ў двух варыянтах, зайважце!*

*Навошта?*

*Безумоўна, можна было б зразумець гэту акалічнасць, калі б школы, ліцэі, гімназіі вялі падрыхтоўку па індывідуальных праграмах — магчыма, у перспектыве так і будзе. Але ж зараз як мінімум 10 аднолькавых дысцыплін вывучаюцца ва ўсіх агульнаадукацыйных установах.*

*Сёлета настаўнікі ўжо здалі свой экзамен. Але хочуць запытацца ў Міністэрства народнай адукацыі: ці мяркуецца і ў наступным навучальным годзе ператвараць настаўнікоў у опрытэраў па адшліфоўцы каліграфічнага почырку?*

ПРЫНЦЫПОВАЕ ПЫТАННЕ

## Ці пад сваім прозвішчам я запісаны ў пашпарце?

**Дарагая «Беларушчына»!**

**Я хачу разабрацца са сваім прозвішчам: як трэба правільна пісаць Равяка ці Рэвяка, калі па-руску — Ревяко? У дзядулі на вёсцы кажуць Равяка, а ў школе настаўніні раяць пісаць Рэвяка. Так, дарэчы, запісана і на адпаведнай старонцы майго пашпарта. У наступным годзе я спадзяюся памяняць яго на новы, беларускі ды баюся, каб туды зноў не трапіла памылка. Чаму мы павінны звацца інакш, чым зваліся нашы дзяды?**

**Руслан РАВЯКА.**

**г. Баранавічы.**

**На пытанне нашага чытача мы папрасілі адказаць старшага навуковага супрацоўніка Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, кандыдата філалагічных навук Ганну УСЦІНОВІЧ.**

— Для напісання твайго, Руслан, прозвішча, праз літару э няма ніякіх падстаў. Літара э ў беларускай мове пішацца, як правіла, толькі пад націскам. Выключэнне складаюць некаторыя словы іншамоўнага паходжання, напрыклад: рэдакцыя, рэвалюцыя. Калі ж напісаць тваё прозвішча праз э, то трэба вымаўляць Рэвяка.

Відаць, гэта прозвішча блытаюць з устарэлым і рэдка ўжывальным уласным асабовым імем Рэвека (рус. Ревека). (Гл. М. Р: Суднік «Слоўнік асабовых уласных імён». Мн., 1965, с. 107). Але гэта зусім іншая рэч і аналогіяй для напісання служыць не можа. Дарэчы, лексічнай асновай, на базе якой утварылася прозвішча Равека, як і Равяка, Равякоў, з'яўляецца слова равека, што азначае равун, той, хто раве, як піша вядомы вучоны М. Бірыла ў сваёй працы «Беларуская антрапанімія. Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі» (Мн., 1969, с. 344). Слова равека выкарыстоўвалася ў беларускай антрапаніміі здаўна, яно зафіксавана ўжо ў XVI стагоддзі.

Няма падстаў адхіляцца ад беларускіх правапісных нормаў і ў такіх прозвішчах, як **Рабушка, Рабцэвіч, Чахоўскі, Чарнякевіч** (а не Рэбушка, Рэбцэвіч, Чэхоўскі, Чэрнякевіч і г. д.) Толькі прозвішчы тыпу Жэбрак, Чэпік зусім справядліва пішуцца праз э—тут яно пад націскам.

Увогуле, правільнасць напісання прозвішчаў складае не толькі лінгвістычную, але і юрыдычную праблему. Многім беларусам прыходзілася і яшчэ прыйдзецца адчуць на сабе ўсе непрыемнасці, звязаныя са стратай, зменай спрадвечнага родавага прозвішча. Тут сплялося шмат прычын, і асноўная з іх — практыка перадачы беларускіх прозвішчаў па-руску ці па-польску. Але гэта ўжо тэма іншай, асобнай гаворкі. Калі яна зацікавіла чытачоў— чакаем канкрэтных пытанняў.

НАША КНІГА

## Апошняя «Бацькаўшчына»?

**У самы бліжэйшы час у кнігарнях паявіцца другі — і апошні! — выпуск штогодніка гістарычнай літаратуры «Бацькаўшчына»**

**Здаецца, зусім нядаўна мы ўсур'ёз турбаваліся аб сваёй нацыянальнай свядомасці, гаварылі аб нашым гістарычным невуцтве.**

**Выдавецтва «Юнацтва» адразу ж адгукнулася на патрэбу часу, заснаваўшы штогоднік гістарычнай літаратуры. У 1990 годзе выйшаў першы томік. Да 100-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча быў прымеркаваны другі выпуск.**

**Але... Не лятась пачалося. Загугнелі чыноўнікі: беларускамоўная кніга — стратная. Заказаў ад кнігагандлю не паступіла і «Бацькаўшчына» была перанесена на 1992 год. Была снасавана серыя: выданне ўжо не лічылася штогоднікам, а — альманахам. І да 75-х угодкаў М. Багдановіча «Бацькаўшчына» не паспела. Добра, што на рэнтуру не пусцілі пад нож. Бібліяфілы, радуйцеся!**

**Хутка выйдзе апошні альманах «Бацькаўшчыны». Абавязкова набудзьце экземпляр, каб захоўваць як засохлую кветку яшчэ адной нясправджанай, задушанай задумы.**

**А ў апошняй «Бацькаўшчыне» вы, мілыя чытачы, знойдзеце знайсці творы, прысвечаныя панутнаму Максіму — генію панутнай краіны-браначкі: Барыса Мікуліча, Міхася Стральцова, Зосьні Верас... Ёсць там аповесць археолага Міхася Чарняўскага, апавяданні былога гулагаўца Яфіма Гаварушні...**

**Галоўны рэдактар выдавецтва «Юнацтва» Міхась Пазнякоў праз тыднёвік «Літаратура і мастацтва» заклікаў: «Абаронім нашу дзіцячую кнігу!». Я не заклікаю да абароны альманаха «Бацькаўшчына». Але хачу, каб мы ўсе разам падумалі пра лёс нечага найдаражэйшага, непаўторнага — але з такім жа самым найменным.**

**НА ЗДЫМКУ: з ілюстрацый апошняй «Бацькаўшчыны» — рупліўцы Беларушчыны Зоська Верас, Аляксей Пяткевіч і Генадзь Каханоўскі (1982 г.).**

**Фота АУТАРА.**

## Ля засохлае крыніцы

Задушана яшчэ адна задума.
І не забава ціха памірае.
Мы зблыталі Зямлю з ліхім Сатурнам,
сваю Дзяржаву з надмагільным краем.

І жвір цячэ са жмені абамлелай
замест жывой вады каля крыніцы.
О як у сэрцы жылка забалела:
жыву я не ў Рэспубліцы — ў бальніцы?

І перад небам стану на калені,
праменьчыку надзеі памалюся.
Заглушаныя нашыя памкненні,
засушаны карэнні Беларусі.

Каб не звялося продкавае збожжа,
не высахлі палеткі залатыя, —
вярні нам Бацькаўшчыну нашу, Божа*:
мы самі не зваюем сілы злыя.

Ішлі пакорненька за кожным дурнем.
Мы не народ — абскубанае пер'е.
Задушана яшчэ адна задума.
Яшчэ адно узроджана бяэвер'е.

* Радок Янкі Купалы з верша «Цару неба й зямлі».

**Сяргей ПАНІЗНІК.**

## Крыжаванка «Купалаўская»



ПА ГАРЫЗАНТАЛЯХ: 5. Рускі паэт, чые вершы «Песня аратага», «Касец» і інш. Я. Купала пераклаў на беларускую мову. 7. Вёска на Маладзечаншчыне, радзіма Я. Купалы. 10. Беларускі пісьменнік і літаратуразнаўца, аўтар манаграфіі «Янка Купала. Духоўны воблік героя». 11. Верш Я. Купалы, напісаны ў 1908 годзе. 12. Верш Я. Купалы дарэвалюцыйнага часу, але змешчаны ўпершыню ў паэтычным зборніку «Спадчына» 16. Аўтар сцэнарыя кінафільма па купалаўскай «Паўлінцы». 18. Санет Я. Купалы, напісаны ў 1910 годзе ў Пецярбургу. 21. Персанаж паэмы Я. Купалы «Зімою». 22. Беларуская паэтэса, якой Я. Купала падарыў сваю кнігу з аўтографам. 23. Татарскі паэт, які пераклаў вершы беларускага песняра на татарскую мову. 24. Літаратуразнаўца, аўтар манаграфіі «Янка Купала. Творчасць перыяду рэвалюцыі 1905—1907 гг.». 25. Персанаж драмы Я. Купалы «Раскіданае гняздо». 29. Латышскі перакладчык Я. Купалы. 30. Верш, напісаны ў 1935 годзе ў Ляўках. 32. Першы друкаваны твор Я. Купалы. 34. Адна з ранніх паэм Я. Купалы. 35. Дзеючая асоба камедыі «Прымані». 38. Персанаж з п'есы «Тутэйшыя». 41. Паэма Я. Купалы, якая мае падзагаловак «Гутарка з мінулага часу». 42. Беларускі кампазітар, аўтар шэрагу рамансаў на вершы паэта. 43. Горад, гісторыю заснавання якога намерваўся Я. Купала перадаць у паэме «Гарыслава». 44. Польскі кампазітар, вершаваны пераклад оперы якога «Галька» зрабіў Я. Купала.

ПА ВЕРТЫКАЛЯХ: 1. Беларускі акцёр, выканаўца ролі Пустарэвіча ў «Паўлінцы». 2. Аднагодак і сяратнік Я. Купалы па літаратурнай творчасці і грамадскай дзейнасці. 3. Купалаўскі мемарыяльны запаведнік. 4. Галоўны персанаж п'есы «Тутэйшыя». 6. Беларускі акцёр, выканаўца ролі Быкоўскага ў «Паўлінцы». 8. Горад, дзе з канца 1917 да пачатку 1919 года жыў Я. Купала. 9. Засценак на Вілейшчыне, дзе Я. Купала сустракаўся з сялянамі, запісваў іх апавяданні, песні, чытаў свае вершы. 13. Беларускі дзяржаўны дзеяч і журналіст, памяці якога Я. Купала прысвяціў верш. 14. Горад маленства, літаратурнага дэбюта, месца працяглага жыхарства Я. Купалы. 15. Назва верша, першыя радкі якога «Спіце ўсе тыя, што праўды па свеце шукалі...». 17. Уладальнік прыватнай бібліятэкі «Веды», дзе ў 1908—1909 гадах працаваў Я. Купала. 19. Паэма Я. Купалы 30-х гадоў. 20. Вёска на Міншчыне, дзе некалькі гадоў жыла сям'я Луцэвічаў. 26. Беларускі драматург і рэжысёр, пастаноўшчык спектакляў паводле твораў Купалы на тэлебачанні. 27. Беларускі драматург, ураджэнец Маладзечаншчыны, аўтар п'есы «Папараць-кветка». 28. Рускі паэт - класік, многія творы якога пераклаў на беларускую мову Я. Купала. 31. Жаночы персанаж з драмы «Раскіданае гняздо». 33. Сатырычная камедыя В. Дуніна-Марцінкевіча, перакладзеная Я. Купалам з польскай на беларускую мову. 36. Абезазімелены селянін у драме Я. Купалы «Раскіданае гняздо». 37. Персанаж з камедыі «Паўлінка». 39. Французскі пісьменнік і грамадскі дзеяч, якому Я. Купала разам з іншымі беларускімі пісьменнікамі накіраваў прывітанне з нагоды яго 70-годдзя. 40. Верш ляўконскага цыкла.

Склаў
**Валерый ПІНЧУК.**
г. Бабруйск.

ЗААПАРК У КВАТЭРЫ

## Папугаі: размнажэнне



**«У мяне вельмі гаваркі хвалісты папугайчык, — піша ў рэдакцыю Вольга Аляксееўна Радкевіч з Любанскага раёна, — дакладней, яна, а не ён. Знесла пяць яечак, прасядзела на іх паўтара месяца і выкінула. І гэта не першы раз. Хацелася б ведаць, у чым справа?**

Хвалістыя папугаі, дарэчы, лепш за ўсіх даюць патомства ў няволі. Яны могуць выводзіць птушанят круглы год, але найлепш вясной і ўлетку, калі многа святла, цяпла і свежай зеляніны.

У залежнасці ад канструкцыі клеткі гняздовыя скрынкі можна падвешваць і ўнутры, але гэта непажадана, таму што нязручна праводзіць кантроль. Скрынкі робяць з нструганых дошак лісцёвых парод дрэў таўшчынёй 2—2,5 см з накрыўкай памераў: для хвалістых — 25x15x15 см, неразлучных — 25x17x17 см і німфаў — 30x25x25 см.

Ляток можа быць квадратны ці круглы (памерам для дробных 5 см, сярэдняй велічыні — 8 см), робяць яго на адлегласці 2—3 см ад верхняй накрыўкі.

Для німфы і хвалістага папугайчыка ў дне скрынкі робяць паглыбленне, каб адкладзеныя яйкі ляжалі разам, не раскатваліся. Сюды насыпаюць трохі сухога бярозавага пілавіння — і гняздо гатова.

Хвалістыя папугаі пачынаюць размнажацца на 7—9 месяцы жыцця. Аднак дапускаць іх да спарвання лепш не раней, чым яны дасягнуць узросту двух гадоў, але не старэй 8—10 гадоў. Пажадана, каб самец і самка былі аднолькавай расфарбоўкі.

Калі пара падабрана ўдала, то хутка пасля развескі гняздоўяў паводзіны птушак становяцца неспакойнымі. Самец корміць сяброўку з дзюбы, перабірае апярэнне.

Каб самкі змаглі знесці добрыя яйкі і выгадаваць здаровых птушанят, патрэбны адпаведныя ўмовы. Акрамя зерневай сумесі, ім штодзённа даюць свежыя кветкі дрэў, агародніну, асабліва моркву і буракі. Для бульбы і агародніны наогул дастаткова ўсяго 100—300 мл вады ,у залежнасці ад велічыні посуда.

Малако трэба кіпяціць толькі пры падаючай тэмпературы, г. зн. з выключаным электрадыскам і пад наглядам.

Каструлі не даліваць да краёў.

Садавіну, розныя кашы, зеляніну, праросшае зерне пшаніцы і мінеральную ежу: мел ці вапняк. Калі ў ежы не будзе солей кальцыю, яйкі будуць без скарлупіны, або папугаі будуць расклёўваць ужо знесеныя нармальныя.

Прыкладна тыдні праз два-тры ў гняздовай скрыні з'яўляюцца 4—5 белых яек. Пасля адкладкі другога яйка самка пачынае іх наседжваць, а астатнія нясе праз дзень. Наседжванне працягваецца 18—24 дні. Бывае, што птушаняты не выводзяцца, ці выводзяцца не ўсе. Гэта — ад няправільнага кармлення і ўтрымання, няправільна зробленай гняздовай скрынкі.

За два-тры дні перад вывадам папугаям павялічваюць колькасць дадатковага корму, каб бацькі не адчувалі недахвату ежы, калі пачнуць карміць птушанят.

У час выкормлівання добра даваць папугаям сумесь з надранай морквы, мурашыных яек, здробненых сухароў з дабаўленнем рыбінага тлушчу. Ахвотна ядуць папугайчыкі салату і пятрушку.

Маладыя птушкі ўпершыню вылятаюць з гнязда ў дробных відаў на 35—46 дзень, у сярэдніх — на 50—60.

За год пара можа выгадаваць чатыры вывадкі, але пасля трэцяга (а яшчэ лепш другога) гняздовую скрыню трэба здымаць, каб папугаі змаглі адпачыць і правесці чарговую ліньку.

## Парады на ўсякі выпадак

Прапануем успомніць старажытны вяровачны вузел, які адрозніваецца ад астатніх прастатой і трываласцю.

Выпадзенне валасоў з малярнага пэндзаля лёгка спыніць. Для гэтага прасвідруйце ў абцісальным кальцы дзірку і пусціце ўнутр некалькі кропель алею.



Зручны разак з ляза брытвы робіцца з дапамогай драўлянай лінейкі і вінцікаў ад цыркуля. Такі разак аблягчае работу і засцерагае рукі ад парэзаў.



Калі труба аслабла і пракручваецца, яе можна ўмацаваць. Устаўце ў гняздо запалку ці некалькі запалак.

Такі драўляны стрыжань з дзвюма дзіркамі на канцах дазваляе лёгка рэгуляваць нацягненне вяроўкі для сушкі бялізны.



«Вядро», якое можна зрабіць са старой аўтамабільнай камеры, не займае ў машыне шмат месца і не грукае.

## Электрычная кухня

**У многіх кватэрах — электракухні, ці, як іх называюць у быце, электрапліты.**

**У параўнанні з плітамі газавымі гэта, бясспрэчна, тэхнічны прагрэс: чыста, няма агню і сажы, цалкам выключана магчымасць атручвання з-за выпадковай уцечкі газу... Аднак той, хто прывык гатаваць на агні (дровах, газе), нялёгка пераходзіць на электракухню.**

**А між тым усё не так складана.**

### Электрапліта і посуд

Каструлі і патэльні павінны па магчымасці цалкам супадаць з паверхняй электрадыска на пліце. Несупадзенне дапускаецца толькі на 1 см па дыяметру. Калі дно пасудзіны значна меншае, награванне будзе адбывацца занадта хутка.

Дно посуда павінна быць ідэальна роўнае. У каструлях тыпу кацялка з выпуклым дном гатаваць на электрапліце практычна нельга.

Звонку дно пасуды трэба старанна ачысціць, гэтаксама, як знутры, бо яно датыкаецца да электрадыска. І дно, і электрадыск павінны быць сухія.

Накрыўкі пасуды павінны ляжаць шчыльна і быць цяжкімі. Пасуда па магчымасці — таксама цяжкая. Ежа ў эмаліраванай пасудзе на электрапліце гатуецца хутчэй, чым у алюмініевай.

### Рэгуляванне тэмпературы

Паколькі электрадыск награецца марудна і яшчэ больш марудна астывае, павышэнне і паніжэнне тэмпературы электрапліты не заўсёды дакладна звязана са ступенню гатоўнасці ежы. Перш чым паставіць пасуду на пліту, трэба пліту нагрэць. Выключаць жа яе неабходна да заканчэння гатавання — дыскі яшчэ доўга захоўваюць высокую тэмпературу.

Калі патрэбна мець так званую падаючую тэмпературу, разагрэць электрадыскі неабходна амаль да пачырванення, паставіць ежу — і пліту выключыць

### Асаблівыя прыёмы

Пачынаць гатаванне ежы трэба з шасцёркі, а потым паступова зніжаць тэмпературу да адзінкі. Незадоўга да канца прыгатавання — выключыць цалкам. Гэта датычыць усіх смажаных і тушаных страў.

Адварваючы прадукты, заўсёды трэба браць вады ці іншай вадкасці (булёну, малака) менш, чым прынята звычайна. Так, для прыгатавання кашы наліваюць вады на 100—150 мл менш (у разліку на кожны літр).

# ВОЗГАЛАС

## «МЫ ЗРАБІЛІ РАКАВУЮ ПАМЫЛКУ, ВЫЕХАЎШЫ З БЕЛАРУСІ Ў АМЕРЫКУ»

**ПЕРШЫЯ ТРОЕ РЭЭМІГРАНТАЎ З ЗАХАДУ ПРЫНЯТЫ Ў ГРАМАДЗЯНСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Наўрад ці меркаваў 55-гадовы слесар Мінскага эксперыментальнага завода Барыс Ізраілевіч Басаў, выязджаючы тры гады назад па ізраільскім выкліку ў Амерыку, — што так хутка давядзецца расчаравацца ў прывабных эміграцыйных далячынях.**

Але, аказалася, хлеб на чужыне не такі салодкі, як многім здаецца тут, на Бацькаўшчыне. Праз два гады эміграцыйнага жыцця муж і жонка Басавы звярнуліся ў Генеральнае консульства СССР у Сан-Францыска з просьбай аб вяртанні. Гаварылі, што паступілі неабдумана, выехаўшы з СССР, што да мясцовых умоў прыстасавацца не змогуць, што ўсё там для іх чужое і ніколі не будзе блізкім, што сумуюць па сыну, па бацьках і раскайваюцца ў зробленай імі памылцы.

Скаргаў на цяжкае матэрыяльнае становішча ў заяве не было, але, мяркуючы па ўсім, жылі Басавы ў ЗША не выкоўна. Прынамсі, Генеральнае консульства нават пайшло ім насустрач і, «улічваючы, што сям'я жыве на дапамогу для беспрацоўных і не мае магчымасці аплаціць поўную суму», спагнала консульскі збор толькі часткова.

На жаль, натоўпы патэнцыяльных эмігрантаў, якія штурмуюць дзверы замежных пасольстваў, слаба ўяўляюць, што іх чакае наперадзе. І справа не толькі ў эканамічных цяжкасцях, немагчымасці адразу знайсці добрую работу, жыллё і г. д. Страшней за любыя бытавыя цяжкасці — настальгія.

«Мой муж знаходзіцца ў пастаянным стане дэпрэсіі і адзіны сродак вывесці яго з гэтага стану — вярнуцца назад, у Савецкі Саюз. Дачка стала зусім замкнутай. Пра сябе я пісаць не магу, бо слёзы засцілаюць вочы. Усё тут чужое і ніколі не будзе блізкім. Мы зрабілі ракавую памылку, парваўшы з усім родным, што засталося ў Савецкім Саюзе». Гэта — радкі з заявы Тамары Басавай да Прэзідэнта СССР.

Муж і жонка Басавы, а таксама іх дзесяцігадовая дачка Даша Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета сталі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Пасяліцца і прапісацца маюць намер у сына ў Мінску. Зусім магчыма, што неўзабаве Барыс Ізраілевіч раніцай зноў будзе спяшацца на свой завод, а Тамара Гаўрылаўна — у сваю цырульню. Нібы і не было трох гадоў развітання. Зрэшты, карціна можа аказацца і не такой ужо ідылічнай. Вяртаюцца Басавы ў іншую Беларусь, якая жыве зусім па іншых законах. Праўда, яшчэ не па амерыканскіх, але і ўжо зусім не па савецкіх.

...А ў Вярхоўным Савеце тым часам чакаюць з Расійскага МЗС яшчэ каля сотні падобных заяў былых жыхароў Беларусі.

**Валянцін ЖДАНКО.**

## НАЙПЕРШ ПРАФІЛАКТЫКА...

**Падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу плакатаў па антыспідаўскай тэматыцы**

Сярод васьмі лепшых плакатаў былі адзначаны прэміямі чатыры. Журы, у якое ўваходзілі прадстаўнікі Міністэрства культуры Беларусі, Саюза мастакоў, Міністэрства аховы здароўя і цэнтра па прафілактыцы СНІДа, вырашыла першую прэмію не прысуджаць. Другую атрымаў за свой плакат мастак У. Мысін (Гомель), трэцяе месца падзялілі С. Ноздрын і Платніцкая (Гомель), В. Жук (Мінск), І. Андронак (Гомель). Трэба адзначыць, што гэта першая сумесная акцыя Міністэрства культуры і медыцынскіх устаноў. Медыкі лічаць, што такіх мерапрыемстваў павінна быць больш, бо і цяпер галоўным сродкам барацьбы з хваробай з'яўляецца прафілактыка, у тым ліку і наглядная агітацыя.

## КУРС—НА ГЕРМАНІЮ

ЖЛОБІН. Аздараўленнем дзяцей Жлобіншчыны занялася мясцовая арганізацыя Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі. Ёй ужо ўдалося дамовіцца з адной нямецкай міласэрнай арганізацыяй аб уключэнні Жлобіна і раёна ў сферу сваёй увагі.

Днямі ў Германію адправілася першая група дзяцей—20 чалавек. Маршрут іх пралёг у Берлін, дзе яны правядуць каля месяца. Жыць дзеці будуць у кемпінгах, а ў выхадныя дні стануць жаданымі гасцямі ў берлінскіх сем'ях.

Плануецца зрабіць такія паездкі рэгулярнымі. Усе расходы нямецкі бок бярэ на сябе.

## Страляў у дзіка—патрапіў у прапаршчыка

**Прапаршчык Васільеў, які гасцяваў у родных у Шумілінскім раёне Віцебскай вобласці, вырашыў пазабавіцца са сваімі знаёмымі П. і Д. браканьерствам. Раніцай наступнага дня труп прапаршчыка знайшлі ў кустах ля дарогі з агнястрэльным раненнем у шыю. На папярэднім следстве П. заявіў, што страляў з незарэгістраванай зброі не ў Васільева, а ў дзіка.**

**Віктар ФЕДАРОВІЧ.**
**БелаПАН.**

## СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ — СЁННЯ Ў НУМАРЫ

**Публікуецца пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб надзвычайных мерах па фарміраванню дзяржаўных рэсурсаў збожжа ў 1992 годзе».**

Гістарычная хроніка да 65-годдзя «СБ» **«Што было, тое было».**

**«Узнагарода прэзідэнта».** Замалёўка Аляксандра Чылікіна пра механіка-вадзіцеля танка Мікалая Чайку, узнагароджанага Франклінам Рузвельтам вышэйшай ваеннай узнагародай ЗША «Крыжам за баявыя заслугі».

Пад рубрыкай «Паклонімся ветаранам» — матэрыял **«Ганаровыя грамадзяне беларускіх гарадоў».**

Іван Чарноў выступае з нататкамі **«Арліныя крылы «Багграціёна».**

Традыцыйная падборка **«У садзе і агародзе».**

Працяг гістарычнага нарыса **«Забытая слава».**

Афіцыяльныя паведамленні, навіны, рэклама.

**Праграма тэлебачання на тыдзень.**

3 ЛІПЕНЯ—ДЗЕНЬ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

# КУРС—НА ЗАХАД

У Цэнтральным архіве Міністэрства абароны былога СССР захоўваюцца дакументы, якія расказваюць аб гісторыі і баявым шляху 135-га гвардзейскага Таганрогскага Чырванасцяжнага ордэнаў Кутузава і Аляксандра Неўскага авіяцыйнага бамбардзіровачнага палка. У вайну ім камандаваў Герой Савецкага Саюза Дзмітрый Данілавіч Валенцік — ураджэнец вёскі Райкова Полацкага раёна Віцебскай вобласці.

Полк, а ў яго саставе служыў і я, дзейнічаў на Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Паўднёвым і 4-м Украінскім франтах. Пасля вызвалення Крыма, у маі сорак чацвёртага года, ён прыбыў на 3-ці Беларускі фронт. Тут увайшоў у 6-ю гвардзейскую бамбардзіровачную авіядывізію 1-й паветранай арміі.

Добра памятаю дзень 23 чэрвеня, калі па загаду Вярхоўнага галоўнакамандуючага пачалася наступальная аперацыя «Баграціён».

Яшчэ напярэдадні экіпажы старшых лейтэнантаў Мікалая Бандарэнка і Пятра Майсеева на самалётах «Петлякоў-2» зрабілі некалькі вылетаў на разведку ў варожы тыл. Яны вялі неаслабнае назіранне за абаронай праціўніка, размяшчэннем жывой сілы і тэхнікі ў раёнах Оршы, Віцебска, Барысава, Мінска, Гродна, Бабруйска і Маладзечна. Бандарэнку і Майсееву даводзілася лятаць у складаных метэаралагічных умовах, прабівацца ў зададзеныя ім цэлі пад моцным агнём варожай зенітнай артылерыі. Нярэдка іх падпільноўвалі нямецкія знішчальнікі. Аднойчы самалёт Бандарэнкі атакавалі два «месеры». Камандзір машыны, яго штурман лейтэнант Аляксандр Воінаў і стралок-радыст старшы сяржант Пётр Баглай уступілі ў няроўны паядынак і выйшлі пераможцамі.

...Раніцай 23 чэрвеня з аднаго з аэрадромаў Смаленшчыны ў паветра ўзнялося 27 чырваназорных бамбардзіроўшчыкаў, якія ўзялі курс на захад. Тры эскадрыллі пад камандаваннем палкоўніка Валенціка пад прыкрыццём самалётаў 9-га гвардзейскага знішчальнага палка нанеслі бомбавы ўдар па магутнай варожай абароне на аршанскім напрамку. Праз кейкі час экіпажы другі раз бамбілі агнявыя пункты, тэхніку і жывую сілу праціўніка на подступах да Оршы.

Ратныя справы воінаў 135-га палка на беларускай зямлі высока адзначыла Радзіма. Полк узнагародзілі ордэнамі Кутузава і Аляксандра Неўскага, ён дзевяць разоў упамінаўся ў загадах Вярхоўнага галоўнакамандуючага. Дзесяткі авіятараў, якія асабліва вызначыліся, былі ўдастоены ордэнаў і медалёў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена камандзіру эскадрыллі маёру Анатолю Балабанаву і штурману эскадрыллі капітану Міхаілу Лашыну.

**Мікалай ПРАВАЛІНСКІ,**
**удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, інвалід.**

**НА ЗДЫМКУ: такімі яны былі летам 44-га. Экіпаж самалёта ў саставе І. СМАРОДЗІНА, С. СТРАЛКОВА, А. МЯЦЕЛІКА.**

# З баямі па роднай зямлі

**Пасля працяглых, цяжкіх баёў у саставе 39-й арміі на Віцебскім напрамку нашаму 472-му артылерыйскаму палку, які атрымаў ганаровую назву «Лёзненскі», трэба было перабазіравацца на другі ўчастак фронта. Зброю з трактарамі пагрузілі на чыгуначныя платформы, а аўтакалону загадана было весці мне.**

**Раніцай, напярэдадні Першамая 1944 года аўтакалона пасля двухсоткіламетровага маршу сканцэнтравалася ў лесе на поўдзень ад Крычава. Захоўваючы строгую маскіроўку, асабовы састаў і ўсю гаспадарку палка сканцэнтравалі ў лесе, але праз трое сутак сваім ходам перадыслацыраваліся ў раён на поўнач ад Мсціслава. Ішла ўзмоцненая падрыхтоўка да баёў. Кожную ноч падыходзілі новыя часці, а ўдзень усё замірала — ніякага руху. Мы бачылі, адчувалі, што збіраюцца сілы для вялікіх наступальных баёў, але месца і час іх ніхто не ведаў. Рыхтавалася аперацыя «Баграціён».**

49-я армія, у саставе якой увайшоў наш 472-гі Лёзненскі гаўбічны артылерыйскі полк рэзерву Галоўнага камандавання («ГАП РГК»), складаў галоўную ўдарную групоўку 2-га Беларускага фронта. Яна мела задачу прарваць варожую вельмі ўзмоцненую абарону на рацэ Проня, фарсіраваць яе, затым Днепр, і ва ўзаемадзеянні з часцямі 50-й арміі авалодаць Магілёвам.

Раніцай 23 чэрвеня 1944 года няспынны гул гармат і мінамётаў абвясціў аб пачатку наступлення нашых войск. Пачалася артпадрыхтоўка. Увесь пярэдні край варожай абароны на заходнім баку ракі Проня ператварыўся ў суцэльную сцяну кавалкаў зямлі, агню і дыму. Паласа мінкага поля была ўзарана нашымі снарадамі, агароджа з дроту, бліндажы праціўніка разбіты, агнявыя пункты знішчаны.

З перанясеннем артылерыйскага агню ў глыбіню абароны немцаў рушылі нашы танкі, а ўслед за імі пайшла ў атаку пяхота і хутка авалодала першымі траншэямі праціўніка. Уцалелыя гітлераўцы здаваліся ў палон.

Ужо ў першы дзень быў ажыццёўлены прарыў абароны на некалькіх участках адначасова ўглыб на 10—12 кіламетраў. Батарэі палка неадступна праследавалі праціўніка, не даючы яму замацавацца на новых рубяжах. Артылерысты першага і другога дывізіёнаў суправаджалі сваю пяхоту дакладным агнём па варожых агнявых пунктах, забяспечваючы рух наперад сваёй пяхоце. Пасля Проні паспяхова фарсіравалі рэкі Бася і Раста і да 27 чэрвеня падышлі да Дняпра, на поўнач ад Магілёва. Камандаванне палка загадала мне, як маючаму грамадзянскую спецыяльнасць гідратэхніка, арабіць разведку ракі і выбраць найбольш зручнае месца для пераправы. Нам удалося ў паласе дзеяння 69-га стралковага корпуса ўначы і на досвітку пераправіць усе гарматы на правы бераг Дняпра.

Пад прыкрыццём артылерыйскага агню батарэй нашага палка і іншых часцей, пяхота 69-га і 84-га стралковых карпусоў фарсіравала Днепр і выйшла на захад Магілёва, перарэзаўшы шлях адыходу праціўніка па шашы Магілёў—Мінск. 28 чэрвеня горад Магілёў быў ачышчаны ад фашыстаў часцямі 49-й і 50-й армій.

Часцям, што вызначыліся ў баях пры фарсіраванні Дняпра і вызваленні Магілёва, у тым ліку і нашаму 472-му артпалку, была прысвоена другая ганаровая назва «Верхнядняпроўскі», а полк узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Вораг, панёсшы вялікія страты людзей і тэхнікі пад Віцебскам, Оршай, Магілёвам, Бабруйскам, страціў кіраванне, застаўся без сувязі, без забеспячэння і рэзерваў, у спешцы адступаў. Вось, напрыклад, што было запісана ў дзённіку аднаго нямецкага афіцэра, які трапіў у нашы рукі 1 ліпеня 1944 года: «Усе зусім знемаглі. Рухаемся далей па шашы на Мінск. Дзікія пробкі і заторы. Частыя абстрэлы злева і справа. Усе ўцякаем. Панічнае адступленне. Многае застаецца на дарозе».

З выхадам злучэнняў 3-га Беларускага і 1-га Беларускага франтоў да Мінска і вызваленнем яго 3 ліпеня 1944 года, на ўсходзе ад яго засталася ў акружэнні вялікая групоўка нямецкіх войск, якая налічвала звыш 105 тысяч чалавек. Стварыўся так званы «Мінскі кацёл»... Для ліквідацыі гэтых варожых войск у «Мінскім катле» былі пакінуты частка сіл 49-й і 50-й армій, у тым ліку і наш артполк.

Памятаецца выпадак, калі група фашыстаў каля вёскі Гатава абыходзіла агнявую пазіцыю першага дывізіёна і нечакана выйшла на размяшчэнне штаба нашага палка. Прыйшлося ўсяму асабоваму саставу штаба, уключаючы повараў і шафёраў, і каменданцкаму ўзводу пусціць у ход аўтаматы і ручныя гранаты. Гітлераўцы вымушаны былі адступіць назад у лес, а затым здацца ў палон.

У гэты час першая батарэя нашага палка рухалася з раёна Чэрвеня па палявой дарозе і каля пасёлка Убель нечакана сустрэла калону немцаў каля 800 чалавек. Завязаўся гарачы сустрэчны бой, хоць сілы праціўніка перавышалі ў шмат разоў. Батарэя ўмомант развярнулася і ва ўпор адкрыла агонь па варожай калоне. Гітлераўцы залеглі, частка адышла ў лес. Але, бачачы, што батарэя толькі адна, без прыкрыцця пяхоты, гітлераўцы раздзяліліся на дзве групы і пачалі наступаць на батарэю з мэтай авалодаць гарматамі. Камандзір батарэі і камандзір узвода кіравання старшыя лейтэнанты С. Бляхераў і Н. Адруховіч узначалілі контратаку, а старшы лейтэнант Г. Улановіч даў каманду заняць кругавую абарону. Тут з лесу з'явілася яшчэ адна група фашыстаў — чалавек 150—200. Цяпер яны насядалі на батарэю з трох бакоў. Стварылася крытычная сітуацыя. У гарачым баі загінулі Бляхераў і Андруховіч. Каб захаваць людзей і гарматы, Улановіч пачаў маневраваць імі і адкрыў агонь прамой наводкай шрапнельнымі снарадамі. А калі гітлераўцам удалося падпаўзці да батарэі на 50—70 метраў і страляць з гаўбіц ужо было немагчыма, Улановіч прымяніў ручныя гранаты, а затым падняў усіх артылерыстаў у рукапашную. Гнеў бою з абодвух бакоў быў вельмі вялікі, фашысты не вытрымалі, кінуліся ў лес, пакінуўшы на полі мноства трупаў.

У гэтым няроўным баі батарэя таксама панесла вялікія страты — 23 чалавекі.

Загінуўшыя воіны былі перазахаваны мясцовымі жыхарамі ў цэнтры вёскі Турэц калгаса «Х з'езд Саветаў», дзе ў 1974 годзе па маёй ініцыятыве і з удзелам кіраўніцтва калгаса быў устаноўлены гранітны помнік-абеліск.

**Іван ГАЛЕНЧЫК,**
**удзельнік аперацыі «Баграціён», кандыдат тэхнічных навук.**

## Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

### АБ НАДЗВЫЧАЙНЫХ МЕРАХ ПА ФАРМІРАВАННЮ ДЗЯРЖАЎНЫХ РЭСУРСАЎ ЗБОЖЖА Ў 1992 ГОДЗЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

4. Міністэрству сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання, Міністэрству хлебапрадуктаў у двухтыднёвы тэрмін распрацаваць і па ўзгадненню з Міністэрствам фінансаў, Міністэрствам юстыцыі, Вышэйшым гаспадарчым судом, Галоўным упраўленнем па гідраметэаралогіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Дзяржкамстатам і іншымі зацікаўленымі міністэрствамі і ведамствамі зацвердзіць парадак абавязковай пастаўкі збожжа ў дзяржаўныя рэсурсы рэспублікі і форму паведамлення на пастаўку.

Аблвыканкомам і райвыканкомам да пачатку ўборкі збожжавых культур вызначыць аб'ёмы паставак збожжа па раёнах і гаспадарках, забяспечыць выдачу гаспадаркам названых паведамленняў і кантроль за паступленнем збожжа.

5. Устанавіць, што калгасы, саўгасы і іншыя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, якія не выканалі абавязковых пастаўкі збожжа да 31 снежня 1992 г., выплачваюць штраф у размеры двухразовага кошту недапастаўленага збожжа. Міністэрству фінансаў забяспечыць спагнанне ўказанага штрафу ў даход рэспубліканскага бюджэту.

Ад выплаты штрафу вызваляюцца калгасы, саўгасы і іншыя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, якія не здалі збожжа з-за стыхійных бедстваў і іншых неспрыяльных умоў.

6. Дзяржэканомплану, Дзяржаўнаму камітэту па знешніх эканамічных сувязях, Міністэрству фінансаў, Міністэрству хлебапрадуктаў, Міністэрству сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання ў месячны тэрмін распрацаваць і ўнесці ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб закупках за межамі рэспублікі 2,5 млн. тон збожжа па міжрэспубліканскаму абмену, за кошт магчымага выкарыстання валютных сродкаў і дадатковага выдзялення на экспарт канкурэнтаздольнай прадукцыі.

7. Міністэрству сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання ў мэтах эканоміі збожжа ажыццявіць перавод спіртавых заводаў на максімальнае выкарыстанне бульбы.

8. Міністэрству хлебапрадуктаў, Міністэрству сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання забяспечыць нарыхтоўку ў 1992 годзе ў лік абавязковых паставак збожжа гатункованага насення збожжавых, зернебабовых і алейных культур у аб'ёме 80 тыс. тон, у тым ліку па Брэсцкай вобласці — 17 тыс. тон, Віцебскай — 12,1, Гомельскай — 8,9, Гродзенскай — 11,6, Мінскай — 22,3 і Магілёўскай вобласці — 8,1 тыс. тон.

Міністэрству хлебапрадуктаў і Міністэрству сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання вызначыць і давесці да калгасаў, саўгасаў і іншых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў парадак водпуску гатункованага насення ўказаных культур.

9. Дзяржаўнаму камітэту па знешніх эканамічных сувязях, Міністэрству гандлю, Міністэрству рэсурсаў пры выдачы прадпрыемствам і арганізацыям ліцэнзій на правядзенне бартэрных здзелак прадугледжваць у абавязковым парадку накіраванне імі на закупку збожжа не менш чым 25 працэнтаў сродкаў ад сумы, на якую заключаны здзелкі па пастаўцы сустрэчных тавараў. А Міністэрству хлебапрадуктаў забяспечыць вяртанне ўказаным прадпрыемствам і арганізацыям рублёвага пакрыцця валютных сродкаў па спецыяльнаму курсу, устаноўленаму Нацыянальным банкам.

У сувязі з гэтым прызнаць страціўшым сілу пункт 7 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 1992 г. № 11 «Аб першачарговых мерах па забеспячэнню Рэспублікі Беларусь збожжам у 1992 годзе» (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 1, арт. 9).

**Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь**
**В. КЕБІЧ.**

**Кіраўнік справаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь**
**М. КАЎКО.**

1 ліпеня 1992 г. г. Мінск.

### Дадатак да пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 1992 г.

**Цэны на збожжа, якое нарыхтоўваецца ў лік абавязковых паставак**

| | Рублёў за тону базісных норм |
|---|---|
| Жыта | 6.000 |
| Ячмень | |
| піваварны | 11.580 |
| радавы | 6.660 |
| Авёс | |
| высокаканатурны (натура звыш 510 г/л) | 8.100 |
| сярэдненатурны (натура ад 460 да 510 г/л уключна) | 7.700 |
| нізканатурны (натура 460 г/л і ніжэй) | 6.040 |
| вырашчаны без пестыцыдаў | 10.060 |
| Пшаніца мяккая | |
| з утрыманнем клейкавіны да 18 працэнтаў | 9.330 |
| з утрыманнем клейкавіны ад 18 да 23 працэнтаў | 11.670 |
| з утрыманнем клейкавіны больш за 23 працэнты | 13.070 |
| Кукуруза | 7.340 |
| Грэчка | |
| радавая | 21.550 |
| вырашчаная без пестыцыдаў | 25.550 |
| Гарох, нялюшка | 8.800 |
| Лубін | 14.050 |
| Віка | 14.050 |
| Боб харчовы | 11.100 |
| Боб фуражны | 9.400 |
| Проса | 5.680 |
| Рапс, свірэліца азімая і яравая, рэдзька алейная | |
| I класа | 15.000 |
| II класа | 11.000 |

**Кіраўнік справаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М. КАЎКО.**

НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ

## Надвор'е прадказваем па паводзінах...

**(Заканчэнне. Пачатак у «Хатняй энцыклапедыі» за 19 і 26 чэрвеня гг.).**

**...Жывёл**

**Коні.** Калі конь храпіць—да непагадзі.

**Авечкі.** Калі яны часцей стукаюцца лбамі — будзе моцны вецер.

**Вавёркі.** Перад добрым надвор'ем яны часцей пакідаюць свае гнёзды, шмат бегаюць і скачуць.

**Краты.** Калі яны выходзяць з-пад зямлі—неўзабаве будзе дождж.

**Кажаны.** Калі пасля захаду сонца кажаны нястомна лятаюць—будзе добрае надвор'е.

● **Калі жывёла прагна есць увечары траву—назаўтра чакай дажджу.**

● **Калі жывёлы сабраліся ў кучу—быць дажджу, моцнаму ветру.**

**...ПТУШАК**

**Вераб'і.** Летам яны лятаюць кучамі перад сухім і ясным надвор'ем. Перад дажджом вераб'і чародкамі збіраюцца на зямлі і купаюцца ў пыле. Калі яны прыціхлі, натапырыліся, то неўзабаве пойдзе дождж. Перад бурай яны хаваюцца пад страху. Калі вераб'і ажывіліся і зацвыркалі ў час працяглай непагадзі, то неўзабаве надвор'е палепшыцца.

**Галкі.** Галкі трывожна крычаць звычайна перад дажджом.

**Берасцянкі.** Перад дажджом яны доўга і надакучліва румзаюць.

**Галубы.** Разбуркаваліся галубы—будзе цёплае, сухое надвор'е.

**Качкі.** Перад дажджом яны няспынна даюць нырца і плюхаюцца.

**Зязюлі.** Калі зязюля кувае на сухім дрэве—ідзе пахаладанне.

**Совы.** Днём совы крычаць —на холад або дождж.

**Ластаўкі.** Калі яны лятаюць нізка над зямлёй, будзе працяглая непагадзь. Калі яны лятаюць высока, надвор'е будзе добрым.

**Гракі.** Улетку перад дажджом яны звычайна часцей «пасвяцца» ў траве, чым на пашы.

**Чайкі.** Калі яны плаваюць—гэта прыкмета ўстойлівага добрага надвор'я. Калі ж яны не лятаюць далёка ад берага і не садзяцца на ваду—ідзе перыяд працяглай непагадзі.

**Чаплі і ястрабы-перапялятнікі.** Калі яны гучна крычаць у палёце, будзе добрае, яснае надвор'е, без ападкаў.

**Глушцы.** Калі надвор'е праз два-тры дні павінна пагоршыцца, то глушца не пачуеш. Калі ж у непагодлівую раніцу яны раптам пачынаюць такаваць, то надвор'е неўзабаве палепшыцца.

**Цецерукі і курапаткі.** За некалькі гадзін перад бурай яны з адкрытых мясцін пералятаюць у гушчар. Летам цецерукі перад дажджом узмоцнена купаюцца ў пяску або дарожным пыле.

● **Духата ў час добрага надвор'я, птушкі замаўкаюць — быць навальніцы.**

● **Калі ў працяглую непагадзь птушкі раптам пачынаюць спяваць —чакайце сонейка.**

**Дзятлы.** Калі дзяцел стукае дзюбай па суку ў добры летні дзень—быць дажджу.

**Фазаны.** Калі з вечара яны ўсаджваюцца на галіны дрэў, то будзе сухая і ціхая ноч. Перад дажджом і моцным ветрам яны хаваюцца ў кустах.

**Вароны.** Калі яны чародамі лятаюць высока ў небе, уздымаючыся да хмар—чакайце непагадзі.

**Пеўні і куры.** Калі ўлетку пеўні раптам пачынаюць кукарэкаць сярод белага дня — неўзабаве пойдзе дождж. Калі ціхай ноччу пераклічка пеўняў чутная здалёк, то днём або к вечару збярэцца ціхі дожджык, які будзе ісці ўсю наступную ноч. Калі ў пахмурнае, дажджлівае надвор'е ў самым пачатку дня раптам пачынаюць спяваць пеўні, то неўзабаве дождж спыніцца і надыдзе добрае надвор'е. Куры кудахкаюць—быць непагадзі. Калі куры не хаваюцца ад дажджу, то ён будзе непрацяглы. За 2—3 дні да дажджу пеўні не спяваюць.

**...РЫБ, РАКАЎ, ЖАБ**

**Рыбы.** Рыбаловы добра ведаюць, што калі рыба не клюе, хоць сонца яшчэ ярка свеціць, значыць надыходзіць кепскае надвор'е. Перад дажджом рыба плавае звычайна блізка ля паверхні вадаёма. Калі плотка нібы пакрытая мыльнай пенай—быць дажджу.

**Ракі.** Перад дажджом яны імкнуцца выпаўзці на бераг.

**Жабы.** Калі яны скачуць па сушы—неўзабаве будзе дождж. Калі яны раскваваліся—будзе непагадзь. Перад дажджом яны «бурчаць». У сухое надвор'е жабы застаюцца ў вадзе, у вільготнае — выходзяць на сушу. Калі яны ўвечары квакаюць з прыемнай трэллю—будзе добрае надвор'е, калі маўчаць—неўзабаве пахаладае.

**...НАСЯКОМЫХ**

**Павукі.** Калі павук сядзіць, забіўшыся, ў сярэдзіне павуціння—то неўзабаве пойдзе дождж. Калі ў час дажджу павукі-цянётнікі пачынаюць раптам плесці павуцінне—чакайце паляпшэння надвор'я. Павукоў і іх сетак мала—надвор'е будзе пераменлівым, калі шмат—будзе добрае надвор'е. Перад пацяпленнем павукі плятуць павуцінне ў паўднёвым кірунку, перад пахаладаннем — у паўночным.

**Мурашкі.** Перад дажджом яны імкнуцца зачыніць ўсе ўваходы ў мурашнік. Перад непагаддзю яны стараюцца далёка не аддаляцца ад мурашніка.

**Камары і мошкі.** Калі яны таўкуцца ў паветры слупом, гэта прадракае звычайна добрае, яснае надвор'е.

**Пчолы.** Перад моцнай гарачынёй яны сядзяць звычайна на сценках вулля, перад засухай робяцца злоснымі і мацней джаляць. Перад добрым надвор'ем пчолы з самай раніцы ляцяць за ношкай. Перад дажджом сядзяць у вуллях і гудзяць або ўзмоцнена лятаюць каля кветак жоўтай акацыі або бружмелю.

**Усе гэтыя народныя прыкметы «дзейнічаюць» звычайна толькі ў летнія месяцы. Бліжэй пад восень мы мяркуем змясціць падборку народных прыкмет надвор'я менавіта восеньскіх. А пакуль што запрашаем чытачоў «Хатняй энцыклапедыі» падзяліцца сваімі ўласнымі назіраннямі, расказаць, як вы самі для сябе прадказваеце надвор'е.**

НЕПАЖАДАНЫЯ СУСЕДЗІ

## Хто «гадуе» камароў?

**У апошнія гады гараджане ўсё часцей заўважаюць у сваіх кватэрах непажаданых суседзяў — камароў. Прычым надакучваюць камары не толькі летам, але часта і зімой. А адказаць на пытанне, пастаўленае ў загалоўку, на жаль, вельмі проста—дапамагаем імкліваму росту камарынага насельніцтва практычна ўсе мы, асабліва бездапаможная ў многіх адносінах жыллёва-камунальная служба.**

Камар-піскун — гэта пра яго ідзе гаворка — вельмі добра адчувае сябе там, дзе ёсць стаячая вада — у падвальных збудаваннях, звязаных з гарадскімі камунікацыямі, і перш за ўсё ў падвальных памяшканнях жылых будынкаў. Калі да гэтага дадаць, што падвалы практычна ніколі адразу не высушваюцца пасля аварый водаканалізацыйных труб, што вокны і дзверы ў іх пастаянна расчынены або выбіты, то ўмовы для развядзення камароў ствараюцца ідэальныя.

Біялогія камара-піскуна вывучана добра. Самкі ў канцы лета звычайна не гінуць, а хаваюцца на зімоўку ў розныя прахалодныя месцы: дуплы, норы, склепы... У гарадах жа, жывучы ў цёплых падвалах, яны застаюцца актыўнымі ўвесь год, а пры асабліва спрыяльных умовах могуць размнажацца ў вялікай колькасці нават у зімовыя месяцы.

Камары могуць харчавацца крывёй розных жывёл і птушак. Вельмі ахвотна і актыўна нападаюць яны і на чалавека. Звычайна гэта здараецца ноччу. Самка, напіўшыся крыві, праз пэўны прамежак часу адкладвае на паверхні стаячай вады 100—200 яек. Лічынкі лепш і хутчэй развіваюцца ў забруджанай вадзе, асабліва ў каналізацыйных водах. Аптымальная тэмпература для развіцця ўсіх чатырох стадый лічынак і стадыі кукалкі — 17—22 градусы. Камары добра могуць развівацца нават у поўнай цемры. Усё развіццё ад яйка да з'яўлення «дарослага» камара ў залежнасці ад тэмпературы ў памяшканні праходзіць за 10—20 дзён. Калі тэмпература нізкая (напрыклад, 9—13 градусаў), то развіццё можа вельмі расцягнуцца па часе, і пры гэтым намнога больш гіне лічынак і кукалак. Пры спрыяльных жа ўмовах у адным літры вады можа быць да 4000 лічынак. Для масавага размнажэння камароў дастаткова нават невялікіх лужын глыбінёй два—тры сантыметры.

Потым яны разлятаюцца па ўсяму падвальнаму памяшканню, праз лесвічныя клеткі і вентыляцыйныя хады пранікаюць у кватэры. У цёплую пару камары з падвалаў вылятаюць на вуліцу і трапляюць у кватэры праз адкрытыя вокны і балконныя дзверы.

З усяго сказанага вынікае і методыка барацьбы супраць камароў. Перш за ўсё (і гэта самы важны момант) утрымліваць у добрым санітарным стане падвальныя памяшканні. Калі здарылася нейкая аварыя, па магчымасці хутчэй трэба высушыць падлогу ў падвале. У халодную пару час ад часу трэба праветрываць падвалы і змагацца супраць камароў холадам. Калі ўсё ж у кватэру яны залятаюць, то трэба ўжыць які-небудзь з аэразоляў супраць лятаючых насякомых — гэтыя аэразолі і цяпер нярэдка бываюць у продажы. Можна яшчэ парэкамендаваць зацягнуць форткі і фрамугі, а таксама вентыляцыйныя адтуліны на кухні і ў ванным пакоі кавалкам марлі або сетачкай з дробнымі клетачкамі якія таксама бываюць у продажы. Пры магчымасці наладзіць скразняк — камары не любяць такога абыходжання.

На жаль, іншых — больш эфектыўных метадаў барацьбы супраць камароў-піскуноў — бадай што і няма.

# ПРАГРАМА ТЭЛЕ-ПЕРАДАЧ

ПАНЯДЗЕЛАК

## 6 ліпеня

**Беларускае тэлебачанне**

14.50. Праграма перадач.
14.55. Беларуская мова.
15.25. Гісторыя.
15.55. Матэматыка.
16.30. Навіны.
16.35. Экран дзіцячага фільма. «Капітан Саўры-галава». Маст. фільм. 1-я серыя.
17.40. Мультфільмы.
18.00. Чарнобыль: праблемы і вырашэнні. Вынікі міжнароднага сімпозіума. Перадача з Магілёва.
18.30. «Наследнік». Дак. фільм.
19.00. Абласныя навіны (Брэст).
19.10. Наш каментарый. «Будучыню шукаем у мінулым».
19.20. Амерыка: бацькі і дзеці. Перадача 6-я.
19.40. Грамадская думка. Канверсія: здабыткі і страты. Прымаюць удзел намеснік Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М. М. Косцікаў, старшыня Дзяржкампрома Беларусі У. І. Куранкоў і намеснік міністра абароны Рэспублікі Беларусь А. І. Тушынскі. Прамая лінія.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Грамадская думка. Працяг.
21.45. «Купальская ноч». Маст. фільм.
22.55. Спартыўны тэлекур'ер.
23.10. НІКа.

**І канал. Астанкіна**

17.00. Навіны.
17.25. НЭП.
17.55. Авіякасмічны салон.
18.10. Футбольны агляд.
18.40. Маст. фільм «Час жоўтай травы».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Музычны фільм «Зоркі рускага балета». 1-я серыя.
21.45. «Новая студыя» прадстаўляе: дайджэст «Прэс-клуба». У перапынку (23.00) — Навіны.
0.10. «Дробязі жыцця». Маст. фільм.

**Канал «Расія»**

12.10. Тэма з варыяцыямі. «Музыка Вены і Парыжа».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.00. Там-там — навіны.
15.15. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
16.15. Мегаполіс.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Далёкі Усход». Тэлеагляд.

**ДА ВЕДАМА ТЭЛЕГЛЕДАЧОЎ І РАДЫЁСЛУХАЧОЎ МІНСКА І МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

**У сувязі з плановым капітальным рамонтам перадаючай станцыі ў Калодзішчах перадачы па ўсіх тэлевізійных праграмах, а таксама па ўльтракароткахвалевых радыёстанцыях 6, 7, 8, 9, 10 ліпеня будуць пачынацца пасля 14 гадзін.**

17.45. Праграма «Ключ».
18.00. Тварам да Расіі.
18.15. «Улада і карупцыя». Частка 1-я.
18.55. Рэклама.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Улада і карупцыя». Частка 2-я.
20.40. «Санта-Барбара». Маст. фільм.
21.30. «Павел Корын. Русь адыходзячая». Да 100-годдзя з дня нараджэння мастака.
21.55. Рэклама.
22.00. Весткі.
22.20. «Ленін з вамі?» Тэлефільм.
22.40. Свет спорту вачамі фірмы «Жылет».
23.10. «Паглядзі». Забаўляльная праграма (Францыя).

## 7 ліпеня

**Беларускае тэлебачанне**

14.55. Беларуская літаратура.
15.25. Матэматыка.
15.55. Фізіка.
16.30. Навіны.
16.35. «Капітан Саўры-галава». Маст. фільм. 2-я серыя.
17.40. «Калі б я быў маім татам». Мультфільм.
18.00. Каралеўскае паляванне. Шоу-казіно.
19.00. Абласныя навіны (Віцебск).
19.10. Наш каментарый. «Ахінея правіць баль».
19.15. Факты і меркаванні. «Час адраджэння, час памяці».
19.45. Эканамічная хваля. Свет пазнае Беларусь. Аб развіцці міжнароднага супрацоўніцтва. Прамая лінія.
20.45. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Бізнес-клуб «Партнёр» прапануе... Дабрачынны тэлеаўкцыён.
21.30. Да 110-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы. Прэм'ера дак. фільма Беларускага тэлебачання «Ніколі я не паміраў».
22.20. Ю. Семяняка. «Паўлінка». Фрагменты з музычнага спектакля.
23.30. НІКа.

**І канал. Астанкіна**

13.05. Свет грошай Адама Смітта.
13.35. Блакнот.
13.40. «Заблудны ў вяках». Перадача з Перміі.
14.00. Навіны.
14.25. «Урокі Вольгі Іванавай».
14.40. «Тры гады». Маст. фільм. 1-я серыя.
15.45. «Бяздомны Канчурджэ». Мультфільм.
16.00. Маст. фільм для дзяцей. «Ганна». 4-я серыя.
17.00. Навіны.
17.20. «Міхаіл Рамадзін. Запрашэнне да падарожжа?».
17.45. Студыя «Палітыка» паказвае...
18.15. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
19.00. Тэма.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «Зіма ў раі». Маст. фільм. 1-я серыя.
22.00. Сітуацыя.
22.30. Пяць кольцаў.
23.00. Навіны.
23.25. «Каханне з першага позірку». Дзень першы.
0.05. Гукавая дарожка.
0.35. «Тры гады». Маст. фільм. 1-я серыя.

**Канал «Расія»**

11.30. «Санта-Барбара». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там — навіны.
15.15. Мульці-пульці. «Каакор — скураны посуд».
15.25. «Дзіцячыя мары» (Францыя). 9-я серыя.
15.45. Студыя «Рост». «Арт-зона».
16.15. Прастора плюс.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Прэзентацыя канала «Санкт-Пецярбург» на Расійскім тэлебачанні.
17.25. «Незгаральная купіна».
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Здабытак рэспублікі. Мастак Галіна Чудакова.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Санта-Барбара». Маст. фільм.
20.15. Фестываль мастацтваў «Красная плошча запрашае...» Гала-канцэрт з удзелам зорак сусветнага балета.
22.35. Весткі.
22.55. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.25. «Арт-абстрэл». Выпуск 3-ці.

АЎТОРАК

## 8 ліпеня

СЕРАДА

**Беларускае тэлебачанне**

14.55. Беларуская літаратура.
15.25. Фізіка.
15.55. Хімія.
16.30. Навіны.
16.35. Для дзяцей. Я. Чапаевецкі. «Мышаня Мыцык». Спектакль Дзяржаўнага тэатра лялек Беларусі.
17.30. Мультфільмы.
18.00. Сенанос на Палессі. Перадача з Брэста.
18.20. «Палёт матылька», «Сказ пра «Царыцу ваз». Дак. фільмы.
19.00. Абласныя навіны. (Гомель).
19.10. Наш каментарый. «Рэха Прыднястроўя».
19.15. Сустрача са Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. С. Шушкевічам. Прамая лінія.
20.15. «Ане Весні». Фільм-канцэрт.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Некалькі слоў па жыллёваму пытанню.
21.45. Урачысты вечар, прысвечаны 110-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Пасля заканчэння—НІКа.

**І канал. Астанкіна**

13.10. Тэлемікст.
13.55. Блакнот.
14.00. Навіны.
14.20. Сёння і тады.
14.50. «Тры гады». Маст. фільм. 2-я серыя.
16.05. «Новыя імёны». Іграюць Г. Гаруноў і Расійскі сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам М. Плятнёва.
16.10. Маст. фільм для дзяцей «Ганна». 5-я серыя.
17.00. Навіны.
17.30. Студыя «Палітыка» паказвае...
18.00. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
18.45. «Накцюрн на флейце вадасцёкавых труб». Аўтарская праграма З. Разанава.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Зіма ў раі». Маст. фільм. 2-я серыя.
22.15. Чорная скрыня.
23.00. Навіны.
23.25. «Каханне з першага позірку». Дзень 2-гі.
24.00. Вытоні аргенцінскага танга.
0.35. «Тры гады». Маст. фільм. 2-я серыя.

**Канал «Расія»**

12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там — навіны.
15.15. Вольны час. «Увага: здымаю!»
15.30. «Вывай, зброя!»
16.00. «Візітная картка». Частка 1-я.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Хрысціянская праграма. «Надзея сёння».
17.45. Версія.
18.00. Апазіцыя.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Тэлегульня «Лога».
19.55. Фестываль «Сан-Вінсент-92».
20.45. «Школа драматычнага мастацтва Анатоля Васільева». Частка 1-я. Платон. «Дзяржава».
22.00. Весткі.
22.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
22.35. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
23.05. «Школа драматычнага мастацтва Анатоля Васільева». Частка 2-я.

## 9 ліпеня

ЗАПРАГРАМУЙЦЕ СВАЁ ЗАЎТРА... Dainova Co Ltd ☎ (0172) 217-408

ЧАЦВЕР

14.55. Беларуская літаратура.
15.25. Фізіка.
15.55. Хімія.
16.30. Навіны
16.35. Экран дзіцячага фільма. «З кошкі ўсё і пачалося». Маст. фільм.
17.50. «Казкі-небыліцы дзеда Ягора». Мультфільм.
18.00. «Звычайнае жыццё доктара Бызава». Дак. фільм.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. «З любоўю да зямлі». Сустрача з выкладчыкамі і навучэнцамі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках.
20.00 «Танцуе Галіна Шляпіна». Фільм-канцэрт.
20.25. Тыдзень беларускага ўрада.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Творчае маладзёжнае аб'яднанне «Крок» прадстаўляе... Студыя «КІТ».
23.05. НІКа.

**І канал. Астанкіна**

13.10. Тэлемікст.
13.55. Блакнот.
14.00. Навіны.
14.25. «Гэта было... было...»
14.40. «Візіт дамы». Маст. фільм. 1-я серыя.
15.50. Маст. фільм для дзяцей «Ганна». 6-я серыя.
16.45. «З вамі Вівекананда».
17.00. Навіны.
17.25. ...Да 16 і старэйшым.
18.05. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
18.50. Студыя «Палітыка» прадстаўляе. Дак. фільм М. Галдоўскай «Асколкі люстэрка». (Дзённік смуткага часу).
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Жонка прадаўца газы». Маст. фільм.
22.10. Фестываль «Белыя ночы ў Санкт-Пецярбургу».
23.55. «Кінатаўр» вачамі Леаніда Ярмольніка.
0.50. «Візіт дамы». Маст. фільм. 1-я серыя.

**Канал «Расія»**

12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. У свеце жывёл.
16.00. «Візітная картка». Частка 2-я.
16.50. Т. Ін. Ка.
17.20. Калідоры ўлады.
17.50. Спявае Ігар Платонаў.
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Студыя «Нотабене».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Санта-Барбара». Маст. фільм.
20.20. Цырк на сцэне. «Марафон дурняў».
20.30. «Хрона». У свеце аўта- і мотаспорту.
21.00. Пятае кола.
22.00. Весткі.
22.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
22.35. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
23.05. Пятае кола. Працяг.

## 10 ліпеня

ПЯТНІЦА

**Беларускае тэлебачанне**

14.55. Беларуская літаратура.
15.25. Фізіка.
15.55. Хімія.
16.30. Навіны.
16.35. Педагагічны экран. Вопыт падрыхтоўкі дойлідаў у Магілёўскім будаўнічым коледжы.
17.15. «Карцінкі па-даўнейшаму». «Казка пра старое рэха». Мультфільмы.
17.30. «Падказкі на манжэтах». Карысныя парады для дзяўчынак.
18.00. «Імя адной я зоркі паўтараю». Дак. фільм.
18.25. «Жывыя струны». Фільм-канцэрт.
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Наш каментарый. «Прыдавачная вартасць».
19.15. Тры кіты. Мастацка-публіцыстычная праграма.
20.15. «Трывалая ніць». Вопыт аб'яднання «Хімвалакно» па захоўванню і ўмацаванню эканамічных сувязей.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Бізнес-клуб «Партнёр» прапануе... Дабрачынны тэлеаўкцыён.
21.30. Відэасалон. «Адпетыя махляры». Маст. фільм (ЗША).
23.15. НІКа.
23.30. Міс Францыя-91. Шоу-праграма.

**І канал. Астанкіна**

11.20. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
13.00. Дак. фільм з серыяла «Запаведнікі дзікай прыроды». Фільм 6-ы.
13.30. Маст. фільм «Марк і Сафі». Фільм 6-ы.
16.20. Відавочнае — неверагоднае.
17.00. Навіны.
17.25. Чалавек і закон.
17.55. ТВ-«Нява»: Хто з намі?
18.15. Дак. фільм.
18.45. «Зямля з Ленебергі». 13-я серыя «Зямля стаў героем».
19.15. Вячэрні альбом. Вершы М. Рубцова чытае А. Локцеў.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «ВІД» прадстаўляе: «Поле цудаў», «Адпачывай», «Праграма Х», пляцоўка «Агляду».
0.20. Хенлейская рэгата. Міжнародныя спаборніцтвы. Перадача з Англіі.
0.40. Візіт дамы». Маст. фільм. 2-я серыя.

**Канал «Расія»**

11.50. «Санта-Барбара». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. Першы тайм.
15.30. «Калядная серэнада». Акадэмія старадаўняй музыкі.
16.15. Прастора плюс.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Адкрыты свет.
17.45. Байкальскі зарапад.
18.10. Так і жывём.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Залатая шпора.
20.00. Экран крымінальных паведамленняў.
20.10. Джэнтльмен-шоу.
20.40. «Рабізаніяда, або Мой англійскі дзядуля». Маст. фільм.
22.00. Весткі.
22.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
22.35. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
23.00. Вячэрні салон.

## 11 ліпеня

СУБОТА

**Беларускае тэлебачанне**

11.00. Тыдзень планеты. Міжнародны агляд.
11.15. Ліфт XX. Сумесная праграма з выдавецтвам «Эрыдан».
12.10. «Лета ў ракавіне». Маст. фільм з субцітрамі (Югаславія). 1-я і 2-я серыі.
14.50. Да 60-годдзя Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. «Зала Арфея». Іграе ансамбль флейтыстаў.
15.20. Для дзяцей. «Суперкніга». Мультфільм. 10-я серыя.
15.55. «Пастка». Маст. фільм.
17.25. «Венефіс-925». Свята Мінска.
18.25. Мультфільмы.
18.50. Канцэрт ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Бізнес-клуб «Партнёр» прапануе... Дабрачынны тэлеаўкцыён.
21.35. «Сінема» прадстаўляе: маст. фільм «Я ведаю, што ты недаеш...» (Італія).
23.10 Беларускія музычныя весткі.
23.45. НІКа.

**І канал. Астанкіна**

11.20. Свята ў Арлеане.
11.40. «Даходнае месца». Тэлевіктарына.
12.30. Прэм'ера дак. фільма «Немцы ў другой сусветнай вайне». Фільм 5-ы «Драма ў паветры і на моры».
14.00. Навіны ( з сурдаперакладам).
14.25. Кніжны двор.
15.15. Маст. фільм «Лёгкія кроскі».
16.55. Врава.
17.55. Мультфільм «Пчала Мая».
18.25. «Забойства». Маст. фільм з кінасерыі «Карупцыя».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Пад знакам задыяка. «Рак».
22.05. Еўропа плюс.
23.00. Навіны.
23.25. Начны канал. «Сон».

**Канал «Расія»**

12.00. Канцэрт ансамбля «Вярозка».
13.00. Весткі.
13.20. «Як праводзяць канікулы Волек і Лёлек». Мультфільм (Польшча).
14.25. Тэнісны агляд.
14.55. Казырная дама.
15.25. Тэатральны раз'езд. Хто дапаможа тэатру.
16.15. Пілігрым. Расійскае бюро падарожжаў.
17.00. Кантрасты.
17.40. Парламенцкі веснік.
17.55. Праграма «А».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Рэтра-КВЗ. «Падмаскоўныя хлопцы».
20.15. Фестываль мастацтваў «Красная плошча запрашае...» Дэйв Сцюарт і Лонданскі камерны аркестр.
22.35. Весткі.
22.55. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.10. «Грані». Маст. фільм.

## 12 ліпеня

НЯДЗЕЛЯ

**Беларускае тэлебачанне**

11.00. Для школьнікаў. Пра шахматы і шахматыстаў.
11.30. «Левашова — ленінградскія Курапаты».
12.10. Асілак. Тэлевізійны спартыўны клуб. Прамая лінія.
13.00. НІКа. Нядзельны дадатак.
13.45. «Не жадай зла, злом павернецца». Хірамант В. М. Прыбыльская.
14.00. Мінская брама. Канцэрт мужчынскага хору «Унія».
15.25. Студыя «Мэта». Тэлепраграма «Культура».
16.25. Філасофія здароўя. Сустрача з паслядоўнікамі Парфірыя Іванова.
17.00. Святочны карагод. Фестываль дзіцячай творчасці.
18.00. Мультфільмы.
18.25. «З панядзелка...» Мы і рынкавая эканоміка.
19.10. Запрашаем на вячоркі. «Купалле». Фальклорны калектыў санаторыя «Світанак» (г. Любань).
20.00. Панарама.
20.25. На шляху да Барселоны. Алена Шаматульская. Мастацкая гімнастыка.
20.40. Калыханка.
21.05. «Сінема» прадстаўляе: маст. фільм «Стваральнік палітычных вобразаў» (ЗША).
22.35. Каралеўскае паляванне. Шоу-казіно.

**І канал. Астанкіна**

11.05. IX Міжнародны фестываль тэлепраграм народнай творчасці «Вясёлка». «Прыходзь і глядзі» (Швейцарыя).
11.40. Гэта вы можаце.
12.20. Свет у вольны час. «КТБ-1» і канал «Франс Інтэрнасіянал» прадстаўляюць...
13.00. Дак. фільм з серыяла «Запаведнікі дзікай прыроды». Фільм 6-ы.
13.30. Маст. фільм «Марк і Сафі». Фільм 6-ы.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.05. Клуб падарожнікаў.
15.55. «Шмат галасоў — адзін свет». Народныя казкі і прытчы розных краін. «У пошуках сонца» (Конга).
16.05. Панарама. Штотыднёвая міжнародная праграма.
16.45. Тэлелоцыя.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.05. «Крыху аб сабе». В. Талызіна, Т. Догілева.
18.35. «Рой». Маст. фільм.
21.00. Вынікі.
21.45. Спартыўны ўік-энд.
22.00. Музычны вечар у Расійскай акадэміі культуры.
0.55. «Руанская дзева па мянушцы Пышка». Маст. фільм.

**Канал «Расія»**

12.00. Тэатр паэзіі. В. Хлебнікаў.
13.00. Весткі.
13.20. Дыялогі дылетантаў.
13.55. XX стагоддзе: у кадры і за кадрам.
15.00. Прэзентацыя Тыдня тэлевізійнага кіно ЗША на Расійскім тэлебачанні.
15.30. Чэмпіянат свету па аўтагонках у класе «Формула-1».
18.00. Момант ісціны.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Мне не жыць без Расіі». Дабрачынны канцэрт у фонд Цэнтра рэабілітацыі воінаў-інтэрнацыяналістаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.
21.00. Крымінальны канал. «Зусім сакрэтна».
22.00. Весткі.
22.20. «Культпаход у тэатр». Маст. фільм.
23.50. Рок-кафэ.

# ТЭЛЕБАЧАННЕ

## 3 ліпеня

**Беларускае тэлебачанне**

14.15. Экран — абітурыенту. Беларуская мова.
14.45. Гісторыя.
15.15. Матэматыка.
15.45. Дзіцячая тэлефілармонія.
16.30. Навіны.
16.35. Сустрэча з народным вакальным ансамблем ветаранаў вайны і працы.
18.05. Дак. фільмы «Дзеці Брэсцкай крэпасці», «Абавязак памяці».
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Наш каментарый. «Вызначэнне».
19.15. «Лявоніха». Тэленарыс пра партызанскую сувязную М. Г. Сувалаву.
19.45. «Захопленыя». Кінанарыс.
19.55. К. Цесакоў. Сімфонія № 4 «Курапаты».
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Святочны канцэрт, прысвечаны 48-й гадавіне вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў.
23.45. НІКа.

**І канал. Астанкіна**

14.00. Навіны.
14.20. Падарунак меламану. Спявае Д. Хварастоўскі.
14.50. «Небяспечны паварот». Маст. фільм. 3-я серыя.
16.00. Свята па імені «На-на».
17.00. Навіны.
17.25. Чалавек і закон.
18.00. Грай, гармоніка!
18.30. Маст. фільм «Зямля з Ленебергі».
18.50. «Шлюб па разліку».
18.55. ТБ — «Нява»: «Хто з намі?»
19.15. «Кіно да запатрабавання». Пра Маскоўскі міжнародны сімпозіум па нейграваму кіно.
19.45. Добрай ночы, малышы
20.00. Навіны.
20.40. «ВІД» прадстаўляе: «Поле цудаў», «Музагляд», «Адпачывай», «Музычная гадзіна», «Матадор».
У перапынку (23.00) — Навіны.
0.15. «Небяспечны паварот». 2-я і 3-я часткі.

**Канал «Расія»**

15.00. Там-там-навіны.
15.15. Тэніс.
16.15. Прастора плюс.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Дарогі і раздарожжы».
14.45. Вольны час.
18.00. Белая варона.
18.45. «Суддзі». Аб Канстытуцыйным судзе Расіі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Насустрач фестывалю мастацтваў «Красная плошча запрашае».
19.55. На сесіі Вярхоўнага Савета Расійскай Федэрацыі.
20.25. «К-2» прадстаўляе: «Фрак народа», «Абзац», «3, 2, 1».
22.00. Весткі.
22.20. «Голас». Маст. фільм.
23.50. Тэніс.

## 4 ліпеня

**Беларускае тэлебачанне**

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Вязень замка Іф». Маст. фільм. 1-я серыя.
9.50. Выступленне старшыні праўлення Белкаапсаюза Р. З. Грышчанкова.
10.00. Паказвае Гродна. Гарадніца.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. С. Кавалёў. «Звар'яцелы Альберт». Спектакль.
12.55. Новае жыццё старых машын.
13.15. «Вязень замка Іф». Маст. фільм. 2-я серыя.
14.20. «Суперкніга». 9-я серыя.
14.55. «Як справы, запаведнік?». «Прышэлец». Дак. фільмы.
15.30. «Не дам памерці памяці...». Маці загінуўшых у Афганістане салдат аб спектаклі «Цынкавыя хлопчыкі».
16.10. Л. Абелёвіч. Партызанская балада». Выконвае Віктар Скарабагатаў.
16.35. Рэпартаж аб свяце праваслаўнай моладзі ў Польшчы.
17.05. Ад слоў — да справы. Прэс-канферэнцыя кіраўніцтва Дзяржкамчарнобыля па пытаннях вытворчасці чыстай прадукцыі.
17.50. Тэлефестываль беларускай песні ў г. Барысаве. Частка 1-я.
19.05. Сялянскай мудрасці крыніцы. Калгас «Слава» Нясвіжскага раёна.
19.25. Тэлефестываль беларускай песні. Частка 2-я.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Сінема» прадстаўляе: маст. фільм «Ушанаванне» (ЗША). 1-я серыя.
22.45. Арт-галерэя. Сустрэча з мастакамі, стваральнікамі «Галгалерэі».
23.30. НІКа.
23.45. Беларускія музычныя весткі.

**І канал. Астанкіна**

6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. Ранішняя гімнастыка.
7.40. Спорт для ўсіх.
8.10. «Музычныя інструменты і іх гісторыі» (Германія). 4-я серыя «Ксіафон».
8.40. Як дабіцца поспеху.
8.55. Радыё «Труба». Забаўляльная праграма.
9.25. Цэнтр.
10.05. «НЛА: неаб'яўлены візіт».
10.35. «Што абазначаюць вашы імёны?»
11.50. Медыцына для цябе.
12.30. «Немцы ў другой сусветнай вайне» (Германія). Фільм 4-ы «Адступленне на ўсіх франтах».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Фільм дзецям. «Блакітная страла (Польшча).
15.10. «Лятаючы суслік».
15.20. Канцэрт.
16.25. У свеце жывёл.
17.05. «Пчала Мая».
17.35. Шчаслівы выпадак.
18.35. Маст. фільм «Чужая старонка». 1-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «Чужая старонка». Маст. фільм. 2-я серыя.
21.40. Да і пасля поўначы. У перапынку (23.00) — Навіны.
0.20. «Мелодыі Брадвея» (ЗША).

**Канал «Расія»**

7.00. Весткі.
7.20. Рэтра. Мая Крысталінская.
8.00. «Маскоўскі бейсбольны...» Міжнародны турнір на прызы Маскоўскага універсітэта.
8.30. Адкрыты свет.
9.15. Прыбанне ў каханні.
9.30. Праграма «03».
10.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
11.15. «Як жыць будзем?»
12.00. Зігзаг удачы. Віктарына.
13.00. Весткі.
13.20. «Вурда модэн» прапануе...
13.50. Тэатральны раз'езд. «Чалавечы голас».
14.10. Пілігрым.
14.55. «Усё наадварот». Маст. фільм.
16.00. Тэніс.
17.00. Дак. панарама. «Калі Віцебск быў Парыжам».
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. «Суддзі». Аб Канстытуцыйным судзе Расіі.
17.55. Музыка ў стылі «пепсі».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «На экране — Амерыка». 2-гі выпуск.
20.00. Адкрыццё фестывалю мастацтваў «Красная плошча запрашае». Сольны канцэрт Хасе Карэраса.
22.35. Весткі.
22.55. Тэніс.

**УДАКЛАДНЕННЕ**

У афіцыяльнай таблицы тыражу выйгрышаў па першым выпуску грашова-рэчавай латарэі Рэспублікі Беларусь, апублікаванай 2 ліпеня 1992 года, дапушчана недакладнасць у кошце рэчавага выйгрышу.

У серыі 005244 № білета 179
серыі 007199 № білета 240
серыі 007284 № білета 180
серыі 007341 № білета 163

трэба чытаць набор мэблі для кухні «Рэкта» коштам 1.819 рублёў.

# НА ДВОР'Е

## 3 ліпеня

Сёння ўдзень па рэспубліцы пераменная воблачнасць, месцамі навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ў Гродна — 18—20, Віцебску і Мінску — 19—21, Брэсце — 20—22, Магілёве — 24—26, Гомелі — 27—29 градусаў цяпла.

У наступныя двое сутак: 4 ліпеня пераважна без ападкаў, 5-га на большай частцы тэрыторыі дажджы. Тэмпература паветра 4 ліпеня ўначы 6—11, 5-га — 9—14, удзень 17—22 градусы цяпла.

**Л. САНКЕВІЧ,**
**інжынер-сіноптык.**

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Намеснік галоўнага рэдактара У. АНДРЫЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін — 32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 132.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

## Што яшчэ можа пыласос?

● У дапамогу ўмельцам з'явілася нямала хатніх станкоў для апрацоўкі дрэва, пластмас, але вось што дрэнна — шмат ад іх пылу і смецця. Для выдалення дробнага пылу, пілавіння да любога станка, рабочага стала можна далучыць пыласос (мал. 1). Каб пыласос працаваў некалькі гадзін, не перагараючыся, уключыце яго праз ЛАТР на паніжанае напружанне (прыкладна ў два разы).

● **У камплект да пыласоса, што працуе на падлозе, дадаецца пульверызатар для распылення фарбы, з дапамогай якога можна пабяліць столь ці сцены. Але гэты фарбараспыляльнік не мае рэгулятара, таму для якаснай работы неабходна падбіраць кансістэнцыю фарбы, разводзячы яе.**

**Вызначыць гушчыню фарбы можна простым спосабам. У фарбу апускаюць палачку з аргшкла. Калі з палачкі фарба сцякае лёгка, тонкім струменьчыкам—можна фарбаваць, не разбаўляючы фарбу.**

● З дапамогай пыласоса фотааматары могуць хутка высушыць праяўленую фотаплёнку, затраціўшы на гэта 15—20 хвілін. Трэба толькі зрабіць невялікае прыстасаванне ў выглядзе фанернай скрыні з адтулінай для трубкі пыласоса. На штыр унутры скрыні насаджваюцца катушкі з плёнкай — і ўключаецца пыласос.

2.

● Пыласос можа стаць памочнікам пры ачыстцы ягад (чарніц, брусніц, абляпіхі і інш.) ад смецця. Канец шланга ўтыркваюць у вывадную адтуліну пыласоса, а другі прымацоўваюць, напрыклад, да ножак перавернутага табурэта (мал. 2).



**Напоўніўшы варонку прасушанымі ягадамі, высыпаюць іх у прамень паветра, што выходзіць са шланга. Ягады будуць падаць у падстаўленую тару, а смецце адляціць убок.**

***

**Мы прывыклі прымяняць пыласос у доме. Але і ў садзе гэты электрапрыбор, бадай, не менш карысны. Мяркуйце самі.**

● Садаводы ведаюць, наколькі надакучлівы занятак — аббіраць усялякіх дробных шкоднікаў у пладовым садзе і ягадніках. З усім гэтым шкодным «смеццем» выдатна спраўляецца пыласос. І калі на ваш сад напалі медзяніцы, галіцы, малінныя жукі і ўсялякія тлі, дык не затрачвайце час на тое, каб аббіраць расліны рукамі, а ідзіце чысціць зялёную вопратку кустоў і дрэў, узброіўшыся пыласосам.

● **Як вядома, шланг пыласоса ёсць магчымасць пераключыць з усмоктвання паветра на выдзіманне. У такім выглядзе пыласос можа выконваць масу карысных спраў у садзе.**

**У інструкцыі, прыкладзенай да пыласоса, паказана, як зрабіць з яго пульверызатар. Замяніце ваду растворам ядахімікату — і пыласос можна выкарыстоўваць, каб апырскаць расліны для аховы іх ад хвароб і шкоднікаў. Ён спатрэбіцца вам і для пабелкі ствалоў дрэў, для апылення раслін попелам, пірэтрумам, серай і іншымі парашкамі, што выкарыстоўваюцца для аховы раслін.**

● Калі садаводу даводзіцца паліць дымавыя кучы, каб зберагчы ўраджай ад веснавых замаразкаў ці ад шкодных насякомых, дык іншы раз дым ідзе зусім не ў той бок, які вам патрэбен. Пыласос, пераключаны на выдзіманне, струменем паветра накіруе дым у патрэбны бок.

● **Штучны ветрык, створаны пыласосам, можа вельмі спатрэбіцца для апылення пладовых дрэў, калі ў час іх цвіцення стаіць бязветранае надвор'е.**

## Адным заходам

У любым інструменце закладзены нейкія скрытыя магчымасці. Возьмем, напрыклад, слясарную нажоўку. Цяжка бывае прарэзаць паз, што крыху шырэйшы за нажовачнае палатно. У гэтым выпадку мае сэнс замацаваць у нажоўцы дваты палатны, такім чынам за адзін праход можна атрымаць паз поўнага профілю (мал. 1 а).

Калі ж замацаваць у станку тры палатны, дык адначасова можна прарэзаць тры пазы (мал. 1 б).

Можна замацаваць палотны па два з кожнага боку — такім чынам з'явіцца магчымасць зрабіць адразу два шырокія пазы (мал. 1 в). А калі злева змясціць нажоўку са сточанымі зубамі, дык гэта дапаможа зрабіць прораз са строга зададзеным шагам і на зададзеную глыбіню.

***

На малюнку 2 паказаны спосаб вырабу гайкі-баранчыка з разьбой М5.

Ад сталёвага вугалка 50х50 мм нажоўкай адразаецца частка шырынёй 10 мм. З рабра напільнікам сточваецца лыска шырынёй 8 мм. Строга па восі атрыманай загатоўкі свідруецца адтуліна і наразаецца разьба. Застаецца зняць задзіры, і гайка-баранчык гатова.




## Азбука паводзін

**ВЕДАЮ, ЯК...**

**«Невукаў застольных шмат ёсць. Барані нас Божа, побач сесці! Мае рацыю паэт: няўменне